№ 17 (327) 12 траўня 2003 www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

Заснаваная ў 1906. Аднoўленая ў 1991. Выходзіць у пятніцы

## Менскія студэнты ў палоне пнэўманіі



У сталіцы Кітаю завіс дзясятак кітаістаў.

старонка 2

### «Мы спынілі канвэер сьмерці»

Гутарка з Анатолем Лябедзькам.

старонка 5

### Захоп «Норд-Осту» санкцыявала ГРУ?

Групу Бараева на Дуброўку прывёў правакатар.

старонка 7

### Беларускае вяшчаньне на АНТ дасягне 80%

Пляны Ягора Хрусталёва.

старонка 6

# Рывок на Захад

**На зьбегу сьвятаў нашаніўцы выправіліся ў падарожжы на захад. Анатоль Сідарэвіч пабываў у Пінску, Андрэй Дынько — у Берасьці, Андрэй Скурко — у Дорах (Валожыншчына). Старонкі 3–4.**



IREX-PROMEDIA

У Берасьці на вакзале сустракаюць Алесю Шкурдоду з Расны (Камянеччына), якая стала пераможцай Сусьветнага конкурсу дзяцей-выканаўцаў у Лос-Анджэласе



Айцец Іван Грудніцкі, праваслаўны сьвятар-бунтар (Берасьце)



АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК



Горадня

АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ





Берасьце

IREX-PROMEDIA



У Роўбіцку (Пружаншчына) яшчэ працуюць бондары. Свой тавар вязуць Любоў і Мікола Гваі

IREX-PROMEDIA

КАЛЁНКА РЭДАКТАРА

## Ці ўсё ў парадку з галавой у мэра Паўлава?

Віцэ-мэр Менску Мікалай Ярохаў зрабіў дробную, але вялікую дурасьць. Нехта Міхаіл Майсеевіч (з Галяндыі!) у гасьцявой кнізе афіцыйнага інтэрнэт-сайту Менскага гарвыканкаму прапанаваў зьмяніць назву станцыі мэтро «Ракаўская», якую маюць дабудаваць за два гады. Сваю прапанову ён абгрунтаваў сугучнасьцю назвы станцыі з словам «рак».

Сталічныя ўлады адрэагавалі імгненна. Дырэктар вылічальнага цэнтру выканкаму Аляксандар Пятроў, вэб-майстар сайту, зьмясьціў паведамленьне: рашэньнем першага намесьніка старшыні Менгарвыканкаму Ярохава «зробленае даручэньне наконт замены назвы станцыі мэтро «Ракаўская», і ў тэрмін да 20 траўня гэтая станцыя атрымае назву «Спартыўная».

Станцыю найменавалі «Ракаўскай» таму, што яна будуецца на месцы, дзе даўней пралягаў Ракаўскі тракт, які вёў да мястэчка Ракава. Адсюль жа пайшлі назвы Ракаўскага прадмесьця, Ракаўскай вуліцы, цяперашнія «Ракаўскі бровар» і «Ракаўскі кірмаш» — тапонімы, безь якіх не ўявіць сталіцы. Ракаў — мястэчка знакавае для беларускае культуры, духу: там жыў Сяргей Пясэцкі, адзін з найарыгінальнейшых пісьменьнікаў XX ст., гэта мястэчка «Народнага альбому», ракаўскай керамікі, ракаўскага базару, айчына інтэлектуальных дынастый Рагойшаў і Янушкевічаў — і гісторыя наша, і сягадзённасьць,

Працяг на старонцы 2.

# Дэпалітызаванае пакаленьне

У Спатканьні маладых літаратараў, што адбылося ў Менску з 1 да 4 траўня, узялі ўдзел фіналісты конкурсу імя Натальлі Арсеньневай, зладжанага Беларускім ПЭН-цэнтрам. 18 фіналістаў, абраных з 177 удзельнікаў, на чатыры дні занурыліся ў сьвет творчасьці.

Падобныя літсэмінары для творчае моладзі ладзіў і ладзіць і Саюз пісьменьнікаў. У Доме творчасьці ў Каралішчавічах на такіх зборках перабывалі бадай усе цяперашнія вядомыя літаратары ды яшчэ плойма тых, хто так і застаўся незаўважаным. Верагодна, і з удзельнікаў сэмінару, зладжанага ПЭН-цэнтрам, — першага, які прайшоў не пад «дзяржаўным крылом», — ня ўсе стануць вядомымі літаратарамі.

Сёньняшніх маладых творцаў цяжка аб’яднаць, нават калі злучыць іх максымальна шырокім назоўнікам: пакаленьне нэкст, пакаленьне гіп-гопу, net-пакаленьне. Бо ў лічніку, як і належыць эпосе вялікага пераходу, розная эстэтыка.

Самы малады з сэмінарыстаў — **Глеб Лабадзенка** — навучаецца ў Беларускім ліцэі. Але ён ужо вядзе паэтычную старонку ў «Голасе Радзімы», «раскручвае ўёй» (гэта ягоныя словы) яшчэ маладзейшых аўтараў. Рыгор Барадулін на сустрэчы з удзельнікамі сэмінару назваў Глеба сваёй надзеяй. Сапраўды, слова ў Глеба пяе само, а некаторыя вобразы настолькі запамінальныя, што пагражаюць разьбегчыся ад аўтара. Прынамсі, А.Хадановіч перасьцярог маладога творцу: «Выраз «папяровае лётала» з твайго вершу можа стаць мянушкай». Аднак Г.Лабадзенка не баіцца ні падобных мянушак, ні нават парадыстаў, якім знойдзецца багатая спажыва ў ягоных вершах.

Імя **Вікі Трэнас** грыміць па менскіх літаратурных асяродках. Гэтая маладая дзяўчына — нібы жывое ўвасабленьне традыцыйнай паэткі: сьветлавалосая хударлявая гадаванка філфаку. І разам з тым — поўная процілегласьцьусялякай традыцыі: скандальна-шумная, з ноткамі адвольнай гістэрыкі ў вершах і падчас іх чытаньня. Кожнае ейнае зьяўленьне на сцэне суправаджаецца гучным пералівам сьвістка, частку вершаў яна чытае ўкленчыўшы. У жыцьці яна больш спакойная, чым на сцэне. Сама паэтка прызнаецца, што марыць стварыць культурніцкую суполку, у якой сабе адводзіць ролю арганізатаркі творчага працэсу.

Іншая мовазнаўца, **Вальжына Морт**, навучаецца ў Лінгвістычным унівэрсытэце. Ейныя паводзіны менш эмацыйныя, чым у В.Трэнас. Затое гэта цалкам кампэнсуецца экспрэсіўнасьцю лексыкі: нецэнзуршчына й слэнг проста-такі раскашуюць у ейных творах. Што выклікала шок і пратэст у старэйшых сяброў журы.

У **Марыі Новікавай** з Падсьвільля (Паазер’е) — іранічны жаночы голас. Сакратар Саюзу пісьменьнікаў **Анатоль Івашчанка** падкупаў сваім інтэлектуалізмам. Вясёлым санэтам на зададзеную тэму авацыю на выніковай вечарыне-кабарэ сарвала эфэктная бляндынка **Валерыя Шугала** — родная сястра Анатоля Брусевіча.

Адзіным расейскамоўным на Спатканьні быў паэт з Магілёва **Дзьмітры Дзьмітрыеў**. І шчыра цешыўся сваім посьпехам, у тым ліку й таму, што «ўпершыню трапіў у цалкам беларуска-

Працяг на старонцы 14.



ГЛЕБ ЛАБАДЗЕНКА

**Валерыю Шугала (Горадня) журы выбрала ў фінал па адным-адзіным дасланым ёю лірычным вершы. А вось санэту, створанаму ёю ў часе Спатканьня, слухачы на вечарыне-кабарэ зладзілі авацыю...**

# Беларускія студэнты ў палоне пнэўманіі

**У Кітаі, апанаваным эпідэміяй атыповай пнэўманіі (SARS), дагэтуль застаюцца студэнты беларускіх ВНУ, пасланыя туды на стаж. Вывозіць з Кітаю іх не зьбіраюцца, хоць сем'і дыпляматаў эвакуявалі.**



Студэнты трох унівэрсытэтаў: Беларускага дзяржаўнага, Менскага лінгвістычнага і Беларускага дзяржаўнага эканамічнага — знаходзяцца ў самім Пэкіне, у Цзянцзыні і ў правінцыі Дылінь. З шасьцёх студэнтаў БДУ, якія перабываюць у Кітаі, трое жывуць там ужо другі год, а рэшта прыехала ўвосень 2002 г. Карэспандэнт «НН» зьвязаўся праз тэлефон зь Міхаілам Асадчым, студэнтам факультэту міжнародных зносінаў, які вучыцца ў Паўночна-Ўсходнім унівэрсытэце (каля Харбіну, правінцыя Дылінь).

Міхаіл кажа, што эвакуяваць на Бацькаўшчыну іх пакуль што не зьбіраюцца: «З навучальных установаў адкліканыя мангольскія, узбэцкія, карэйскія ды японскія студэнты, бо гэтыя краіны зачыняюць свае межы з Кітаем. Нас не адклікаюць, бо Расея пакідае сваю мяжу адкрытай, а ў Беларусь мы езьдзім праз яе.

Суседні з намі Дылінскі ўнівэрсытэт зачынены, бо там выявілі дваіх хворых на атыповую пнэўманію. Наш кампус (студэнцкі гарадок) закрылі для кітайцаў, але заняткаў для замежнікаў (то бок для нас) не спынілі. Таму нам (хоць і з пэўнымі цяжкасьцямі) удалося дабіцца дазволу на выхады ў горад — па пропусках.

У кампусе пастаянна праводзяць дэзінфэкцыю, перадаюць парады, як засьцерагацца ад хваробы. Усім раздалі маскі, але на занятк мы ходзім бязь іх: карысьць ад іх ёсьць хіба ў вялікай гурме людзей ды ў грамадзкім транспарце».

Беларускі студэнт спадзяецца хутка вярнуцца дадому: у зьвязку з эпідэміяй Паўночна-Ўсходні ўнівэрсытэт скасаваў вакацыі, таму навучальны год выйдзе карацейшы за звычайны.

Тым часам першы сакратар аддзелу прэс-службы Ўпраўленьня інфармацыі МЗС Сяргей Скварцоў на брыфінгу 8 траўня зазначыў, што з Кітаю эвакуяваныя сем'і беларускіх дыпляматаў (самі дыпляматы засталіся). Чыноўнік прызнаўся, што МЗС ня ведае, колькі нашых суайчыньнікаў можа быць у Кітаі ды іншых краінах таго рэгіёну.

**Аркадзь Шанскі, СР**

# Ці ўсё ў парадку з галавой у мэра Паўлава?

**Працяг са старонкі 1.**

цэлая Беларусь у мініятуры зь яе непаўторным духам і калярытам. Таму гісторыкі і тапографы, вывучыўшы пытаньне, параілі назваць наступную за «Пушкінскай» станцыю менавіта «Ракаўская». Столькі ўжо пісалі пра безгустоўнасьць «Жамчужных», «Пралетарскіх» ды от «Спартыўных» (новая ідэалёгія!) — здавалася, толькі разумова непаўнавартны чалавек гэтага не засвоіў. Але каб у розуме была справа — у савецкай эстэтыцы, што засталася ў спадчыну савецкім беларусам, і слабым веданьні ня толькі гісторыі краіны, але і геаграфіі, бо нават дарогі вялі тады не ў Барысаў, а ў Маскву. То не драбніцы, то пытаньне павагі да краіны — яе культуры,назоваў і духу, без станоўчага адказу на якое ні парадку, ні красы ня будзе ў нас.

Калі кіравацца лёгікай намесьніка мэра Паўлава, трэба і сам Ракаў пераназваць у Спартагорск, а ўсім Ракам памяняць прозьвішчы на Рыбаў.

Бздура з гэтай «Ракаўскай», вакол і не такое творыцца, але ж прыкра. Напішуць у Расеі і Польшчы: «Менскі гараданачальнік зьмяніў назву амаль дабудаванай станцыі мэтро...» Ахрысьцілі станцыю прадумана, узважана, а перайменавалі без абмеркаваньня, без уліку думкі спэцыялістаў, інтэлігенцыі, адным росчыркам пяра.

Грамадзтва адхіленае ад абмеркаваньня нават культурна — ужо ня толькі палітычна — значэнных рашэньняў. Зь людзьмі ня раяцца. Дырэктывы прымаюцца келейна. Адначасова зь Ярохавым на іншым канцы авэніды Скарыны кіраўніцтва тэлерадыёкампаніі, таксама келейна, вырашыла стварыць на хвалях радыё «Сталіца» новую FM-станцыю — расейскамоўную. Чаго? Нашто? Чаму не параіцца з грамадзкасьцю? Адзіная белмоўная FM-станцыя — гэта, як ні круці, ня толькі ўласнасьць тэлехлопцаў, а таксама ж якаяніякая супольная каштоўнасьць у краіне, дзе тры чвэрці грамадзянаў шануюць родную мову. Бо адзіная. (А вы, стваральнікі Нацыянальнага ўнівэрсытэту, па-ранейшаму квапіцеся, каб ён быў дзяржаўным, затое бясплатным?)

А ўсё таму, што для Ярохава «Спартыўная» гучыць лепш за «Ракаўскую»; густы тут выдаюць цывілізацыйную прыналежнасьць. Беларусу ж назва «Ракаўская» мілейшая, а «Спартыўная» для яго — савецчына. Гэта больш чым розьніца ў палітычных поглядах, гэта розныя эстэтыкі. Па-ранейшаму, на жаль. Фатальны правал інтэграцыйных праектаў не зьмяніў густаў некаторых кіраўнікоў, і пакуль такой зьмены не адбудзецца, пакуль думка грамадзкасьці — не абстрактнага «Міхаіла Майсеевіча», а канкрэтных вучоных, духоўных аўтарытэтаў, спэцыялістаў — ня будзе цікавіць улады, ні дыялёг, ні кансалідацыя ў грамадзтве ня будуць магчымыя, будзе і далей пароцца гарачка, будзе працягвацца барацьба не на жыцьцё, а на сьмерць двух цывілізацыйных выбараў, дзьвюх эстэтык.

Заклікаю інтэлігенцыю, найперш з урадавых асяродкаў і выданьняў, падаць, пакуль ня позна, голас у абарону «Ракаўскай». А мэр Паўлаў зрабіў бы мудра, адмяніўшы рашэньне свайго намесьніка.

**Андрэй Дынько**

# Цэны на нафту вызначаць ЗША



**У пятніцу грамадзкасьці быў прадстаўлены поўны тэкст унесенага на разгляд Рады Бясьпекі ААН праекту амэрыкана-брытанскай рэзалюцыі па Іраку. Вашынгтон разьлічвае на прыняцьце гэтай рэзалюцыі да 3 ліпеня, калі скончыцца чарговы тэрмін дзеяньня праграмы «Нафта ў абмен на харчаваньне».**

Асноўныя пункты рэзалюцыі:

1) Неадкладная адмена ўсіх фінансава-эканамічных санкцый супраць Іраку (за выключэньнем эмбарга на пастаўкі ўзбраеньняў), уведзеных пасьля жніўня 1990 г.;

2) ЗША і Вялікая Брытанія ў афіцыйным лісьце на імя генсака ААН, у адпаведнасьці з нормамі міжнароднага публічнага права, прызнаюць сваю адміністрацыю ў Іраку «акупацыйнымі ўладамі» і бяруць на сябе адказнасьць за сытуацыю ў краіне. Статус акупацыйных уладаў змогуць атрымаць і трэція краіны, якія пажадаюць далучыцца да стабілізацыйных сілаў;

3) У мэтах фінансаваньня гуманітарных праграм і праектаў аднаўленьня эканомікі Іраку, акупацыйныя ўлады ствараюць Фонд дапамогі Іраку, у які будуць паступаць усе сродкі ад экспарту нафты;

4) Рахункамі фонду «распараджаюцца акупацыйныя ўлады, улічваючы думку часовай іракскай адміністрацыі, аж да стварэньня легітымнага ўраду»;

5) Фонд будзе мець пастаянную раду, у якую будуць запрошаныя назіральнікамі прадстаўнікі ААН, МВФ, Сусьветнага банку і іншых арганізацый. Кіраваць Фондам будзе дырэктарат Цэнтрабанку Іраку (цяпер яго ўзначальвае былы намесьнік міністра фінанасаў ЗША Пітэр Макфэрсан) аж да стварэньня легітымнага ўраду Іраку. Назіральная рада мае права выбраць незалежнага аўдытара для праверкі расходаваньня сродкаў Фонду;

6) Частка паступленьняў у Фонд (згодна з кулюарнымі зьвесткамі, прыкладна 5%) пойдзе на кампэнсацыю Кувэйту за іракскую агрэсію 1990 г., а таксама «на патрэбы па задавальненьні падобных выплат»;

7) Рэзалюцыя прадугледжвае поўнае згортваньне праграмы ААН «Нафта ў абмен на харчаваньне» на працягу 4 месяцаў. Гэты час спатрэбіцца для канчатковага выкананьня ўсіх кантрактаў, заключаных у рамках гэтай праграмы. Некаторыя кантракты, заключаныя ў рамках праграмы ААН, могуць быць падоўжаныя ў выпадку іх гуманітарнай важнасьці, сярод іх, магчыма, будзе і ўгода з Расеяй на пастаўку труб для трубаправодаў на 1,6 млрд. даляраў;

8) Усе будучыя зьдзелкі па экспарце іракскай нафты павінны мець юрыдычны імунітэт;

9) Сакратарыят ААН павінен прызначыць паўнамоцнага прадстаўніка ААН па каардынацыі гуманітарных праграмаў у Іраку, а таксама па супрацоўніцтве з акупацыйнымі ўладамі ў стварэньні «ўрадавых структур Іраку, ахове правоў чалавека, адраджэньні паліцэйскіх сіл і правядзеньні судовай і заканадаўчай рэформаў»;

10) Пэрыяд адказнасьці за правядзеньне ў Іраку такіх пераўтварэньняў — 12 месяцаў. Новы пэрыяд паўнамоцтваў акупацыйных уладаў пачынаецца аўтаматычна, дадатковая санкцыя Рады Бясьпекі ААН для гэтага патрабавацца ня будзе;

11) Дакумэнт заклікае ўсе краіны сьвету адсочваць і прадухіляць гандаль культурнымі каштоўнасьцямі, выкрадзенымі з Нацыянальнага музэю і Нацыянальнай бібліятэкі Іраку.

**СП**

# Юбілей прэзыдэнта Эстоніі



Прэзыдэнту Эстоніі Арнольду Руйтэлю ў суботу споўнілася 75 гадоў. Раніцай яго разбудзілі хор Таварыства мужчынскай песьні Эстоніі ды аркестар Сілаў абароны, якія выканалі перад палацам кіраўніка дзяржавы «Песьню мужчын» эстонскага кампазытара Мііны Хярм. Павіншаваць Руйтэля прыехалі былы прэзыдэнт Эстоніі Ленарт Мэры, сьпікер парлямэнту Энэ Эргма, прэм'ер-міністар Юхан Партс, кіраўнікі дзяржаўных структур, старшыні паветаў, дзеячы культуры і навукі, дыпкорпус.

Урачыстая вечарына ў гонар юбіляра прайшла ў Мастацкім музэі ў Кадрыёргу. Наведнікі парку Кадрыёрг змаглі падысьці і асабіста павіншаваць Руйтэля. Для іх быў накрыты стол з крэндзелямі і гарбатай.

ПРАВЫМ ВОКАМ

# Усё хакей

Дзеля таго каб займець дакладнае ўяўленьне пра стан Беларусі, за апошнія два тыдні варта было абстрагавацца ад бягучкі — пагатоў сьвятаў — і проста паглядзець хакейны чэмпіянат сьвету. У фінскім лёдзе, быццам у люстры, адбіліся ўсе бледныя надзеі й відавочныя хібы сёньняшняй беларускай сьвядомасьці. Як вынік, нашая зборная зь сьвістам праляцела ў ніжэйшы дывізіён.

Зь першага ж матчу стала ясна, што беларусы падрыхтаваліся прайграваць і гуляць на выжываньне — клясычны нацыянальны настрой. Калі глядзіш такі хакей бязь веры ў перамогу — чыста фізычна не хапае паветра. Увесь час заміраеш з стоеным дыханьнем: абы не прапусьцілі, абы вытрымалі. Няўзброеным вокам відаць, наколькі апатыя скоўвае рухі і трымае беларусаў ля сваёй брамы: куды ўжо нам, усё роўна *тыя* мацнейшыя. Няма волі. Няма лідэра, які павядзе за сабой каманду.

А які шыкоўны быў геапалітычны кантэкст! Выйграем — і тады змагаемся з Расеяй за месца на п'едэстале. Прайграем — трапляем на месца ЗША ў турніры на выбываньне зь фінальнае лігі. Усё вырашыў матч з латышамі: там, дзе нам было дастаткова і нічыёй, бел-чырвона-белыя прыбалты разграмілі чырвона-зялёных беларусаў.

Прэзыдэнцкая адміністрацыя пацярпела буйную паразу. Аматары клянуць галоўнага хакеіста краіны, ягоны рэйтынг падае. Для апазыцыі гульня была бяспройгрышнай. Выйграюць нашыя — жыве Беларусь! Пралятаюць — жыве Беларусь без Лукашэнкі! Праўда, ніводная партыя шанцу сыграць на гэтым, як заўжды, не скарыстала.

Можна вінаваціць у правале і самога Аляксандра Рыгоравіча, і трэнэра, і савецкую школу. Але фундамэнтальная прычына крызысу што ў хакеі, што ў палітыцы, што ў грамадзтве агульная — разгубленасьць і бязьвер'е. Калі людзі не адчуваюць пад сабою краіны, маюць правінцыйную псыхалёгію, змагаюцца за прэміяльныя, а не за гонар — яны асуджаныя на пройгрыш.

Што рабіць? Ставіць на сьвежую моладзь, на зьмену пакаленьняў. Сіла нацыянальнае ідэі ўрэшце знойдзе сабе выйсьце скрозь апатыю, падаўленасьць і зьняверанасьць — і аднойчы на вачох ва ўсяго сьвету накідае шайбаў і швэдам, і расейцам, і Амэрыцы.

А эпоха Лукашэнкі ў народнае памяці так і застанецца адпаведнымі палацамі ды нашай паразай у хакеі — гульні для мацакоў на сьлізкім лёдзе. Як пішуць у Інтэрнэце, хакей — усё, кропка, бай.

**Павал Севярынец**

# Захад ёсьць Захад

У прыбіральні цягніка Менск—Берасьце ўжо маюцца папяровыя ручнікі й туалетная папера — рэч кагадзе нечуваная. Ёсьць і міндзюрка для вадкага мыла, але самім мылам яшчэ не запраўленая. За вокнамі цягніка краіна патанае ў сьмецьці. У звалкі ператвораныя ўсе лесапалосы, яры і кар'еры ў ваколіцах населеных пунктаў. Пакуль дрэвы не прыбраліся ў зялёны ўбор, гэтая парнаграфія бессаромна бялее, чарнее сярод зварушанай ральлі і рудых аблогаў. Зямля сьметнікаў — так, напэўна, думаюць эўрапейцы.

Але мінаеш Негарэлае, і сьметнікі зьнікаюць. Пераехалі ў Заходнюю Беларусь. Яшчэ гадзіна дарогі да Івацэвічаў, і зазелянеюць алешнікі. Па Шчары праходзіць нейкі кліматычны разлом. За Косавам-Палескім пачынаецца край вінаграду, абрыкосаў, пэрсікаў і гаматных заходнепалескіх гаворак.

Ці адрозьніваецца яшчэ Заходняя Беларусь ад Усходняй і чым? Адзін мастак напісаў у «Свободных новостях» катэгарычнае: нічым.

У Жабінцы на мосьце гіганцкі надпіс «НАТО здесь». Якое небеларускае мысьленьне: мазгавы беларус і па-расейску напісаў бы «НАТО тут». І ў той жа час выпіс сядзіць на сваім месцы, як уліты: калі NATO ў Малашэвічах і Беластоку, дык чаго б і ня ў Жабінцы?

На пад'езьдзе да Берасьця бэтонныя платы ўкрытыя графіці — высокае мастацтва, прыродны бумбамліт. «Як сьпеў — першы, каханьня, — зь якога і ўзьнікла зямля», — так пяе берасьцейскі ўнівэрсытэцкі рок-гурт «Сьцяна». У часы майго маленства такога не было. Сярод графіці ўсьцяж — Зубр, Край. Край, Зубр. Ніводнага разу — БРСМ.

* * *

Пінск у крызысе, выжывае на агурках. Паўночна-заходняя Беларусь, нязьменны беларускі heartland, нібы замёрла ў сваім разьвіцьці. А ў Берасьці — капіталізм. Пераможна прыватызаваны сэктар паслугаў і здэградаваная, амярцьвелая прамысловасьць — гіганты-заводы электрамэханічны, «Колератрон», «Мясамалмаш» здаюць свае неабсяжныя цэхі ў арэнду дробным камэрсантам. Якія зьбіраюць якую-небудзь мэблю, і толькі ўсяго. І дзякуючы гэтаму, усё ж, дачы пустуюць сотнямі. Людзі маюць уласныя «справы», працу і ня бачаць патрэбы страхавацца натуральнай гаспадаркай.

На рагу Машэрава й МОПРа (няма сэнсу перакладаць на беларускую, хоць мала застаецца тых, хто ведае, чым займаўся МАДР, на гранты якога, між іншым, існавала і КПЗБ), дзе ў часы майго дзяцінства знаходзілася ўбогая «садавіна-гародніна» зь зялёнымі замыканымі скрынямі пад кавуны абапал дзьвярэй, цяпер люксусовага дызайну аптэка. Працуе на тры акенцы з 7-й да

**Працяг на старонцы 13.**



АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

# Радаўніца ў Дорах

Уся Валожыншчына — гэта несканчоныя, як сказаў бы вайсковы чалавек, складкі мясцовасьці. Узьяжджаючы на гару, як на мапе бачыш вакольныя вёскі ў лагчынах, грыўкі лясоў на ўзвышшах. Пульхныя прастакутнікі ральлі (зямля — без адзінага каменьчыка), на тлустых баках узгоркаў нібыта дуба стаяць. А зьедзеш у лагчыну — краявід прападае. Нічога не відаць, апроч неба.

Дорскія клады — таксама на грудку. Зь іх як на далоні бачная вёска. Адзіная дарога адтуль ідзе паўз «новую» царкву — цагляна-сылікатную, з бляшанай «цыбулінай» наверсе. Старую спалілі ў вайну разам зь людзьмі.

Машынаў, што атачылі ўсе падыходы да дорскіх могілак на Радаўніцу, хапіла б на добры фэст. У асноўным гэта сярэдняй рукі іншамаркі. Уздоўж іх шэрагу, шукаючы вольнага месца, едзе дзядзька на калёсах.

Хто прыпазьніўся — сьпяшаецца парадкаваць магілкі родных. Пясок цягаюць мяхамі. Дзе-нідзе дзірван выбіваюць гачкамі, амаль як на бураках. Акуратныя шэрагі пахаваньняў з дыхтоўнымі каменнымі й цаглянымі помнікамі цягнуцца ў прылесак. На магілах — палумыскі з цукеркамі, печывам, велікоднымі яйкамі, гарэлка ў чарках. Жыцьцесьцьвярджальна, халера, глядзіцца. Багата старасьвецкіх памятак — сечаных з каменю, з каменнымі ж крыжамі наверсе. Хоць апошнім часам усё больш ставяць гранітныя «разгорнутыя ветразі». Пад адным зь іх плыве ў вечнасьць і мой дзед Павал.

Іду ўздоўж абгародак — Шэўчыкі, Дзянісікі, Квачы, Ганчарыкі, Каралі, Супроны, Нелюбы. Ёсьць і Кебічы, хоць іхнае «родавае гняздо» — ня Доры, а блізкая Канюшаўшчына. Колішні прэм'ер таксама адтуль. Трапляю ў старую, ваенную частку: «забіты немцамі ў 1942 г.», «забіты ў 1943 г.», «забіты ў 1945 г.» — яўна ўжо ня немцамі. Тамсама нямала і дзіцячых пахаваньняў з маленькімі крыжыкамі. 85-гадовая баба Ганька, што пахавала аднаго за адным чатырох немаўлятаў, парадкуе іх магілку: прыладжвае да крыжа якісьці вяночак. Сьвечак ня паліць: вецер вялікі. Ейныя дзеці, якія засталіся жыць, ужо маюць сваіх унукаў.

«А ты, бабуля, чаго на могілкі зь сякерай прыйшла?» — чуецца зь іншага канца. Гэта дорскі бацюшка. У сінім пінжаку паўзьверх расы ён па-спрынтэрску аблятае шэрагі абгародак. Сьпяшаецца: трэба ехаць яшчэ на Яршэвіцкія клады, што таксама «замацаваныя» за ім. Сьвянціць на скорую руку толькі тыя магілкі, каля якіх ёсьць жывыя сваякі. Калі на бацюшкава «Хрыстос уваскрос!» людзі адказваць лянуюцца, ушчувае: «Вы што — ня елі сёньня? Павітайцеся з *стваральнікамі вас*!» Тутэйшае напаўпаганскае мысьленьне ён засвоіў добра. А мо і ня меў іншага: хтось пад вялікім сакрэтам распавядае, што за саветамі бацюшка быў энэргетыкам у Берасьці, але пасьля пачаў заглядаць у чарку дый «перакваліфікаваўся». Праўда ці не — невядома. Здараюцца і не такія мэтамарфозы: былы старшыня сельсавету й калісьці зацяты камуніст носіць за сьвятаром палатняную торбу з грашыма. Пасьвянцаная магілка каштуе тысячу. Людзі даюць па дзьве.



АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

Выправіўшы бацюшку, паселі сваімі сем'ямі палуднаваць. Умэнт зьявіўся пікапчык-аўтакрама з гарэлкай, віном, печывам ды мінэралкай. Заяжджае проста на могілкі. Але попыту вялікага няма: з сабою папрывозілі смачнейшага. Дый мужчыны «за рулём» праз аднаго — дзе ж тут піць? Падыходзяць сваякі ў трэцяй, чацьвертай стрэчы, у кімсьці незнаёмым раптам угадваеш уласнага прадзеда з фатаздымку, толькі маладзейшага.

Урэшце, зьбіраемся дахаты. Разьвілка ў Дорах: дарогі на Шараі й на Нелюбы. На месцы старой царквы — «муміярал з скульптурамі». «Наставілі пудзілаў», — бурчыць бабуля. Павяртаем налева: хочацца зірнуць на колішнюю дзедаву сядзібу.

Мінаем былы мэхдвор. Шкілеты тэхнікі, бэтонныя шулы ад кароўнікаў ды ангараў досыць рэальна адлюстроўваюць стан калгаснае гаспадаркі. Шчодра палітая саляркай зямля тут доўга ня будзе радзіць. А колісь гэтым месцам былі найлепшыя на ўсю ваколіцу гароды.

Дзедаў дом, у якім ужо дваццаць гадоў жывуць чужыя людзі, так і не прыняў новых гаспадароў. Дый яны і не стараліся: не рамантавалі яго, не фарбавалі. Нібы там ніхто й ня жыў пасьля нас. Селі будынкі, абваліліся платы. Адзінае, што збудавалі новыя гаспадары, — сабачая будка. Адтуль выскоквае сабачка, яхкае пару разоў ды ўцякае. Двор, вялізны ў дзіцячай памяці, нібы скруціўся, сьціснуўся. Але на ім я пачуваўся надзіва спакойна й абаронена. Нібыта само гэтае месца пазнала і прыняло мяне. Такі стан, відаць, і завецца адчуваньнем дому — кропкі адліку, у якой ты здольны чуць галасы продкаў. Але бавіцца тут не выпадае. Паваротка на Менск. Бывайце ўсе — да наступнае Радаўніцы.

**Андрэй Скурко**

Анатоль Сідарэвіч

# У Пінску змрок


IREX-PROMEDIA

У Заходняй Беларусі ёсьць тры гожыя гарады — Пінск, Нясьвіж ды Горадня. Мо шчэ старое Берасьце. Але Пінск — сталіца. І з гэтым ніхто не спрачаецца, маючы наўвеце: сталіца Палесься. Ды з тае пары, як тут жыве кардынал Казімер Сьвёнтак, Пінск — сталіца для рыма-каталікоў нашае краіны. Яго Эмінэнцыя застаўся жыць у горадзе, якому аддаў большую частку свайго жыцьця.

Налета споўніцца 50 гадоў служэньня ксяндза Сьвёнтака ў Пінску. Ён уратаваў ад апаганьваньня касьцёл Унебаўзяцьця Дзевы Марыі (за сьцяною, у францішканскім кляштары, месьціўся Дом афіцэраў, ладзілі танцулькі, а таксама вучылі матросікаў). А маглі ж ня толькі апаганіць, але і зруйнаваць, як езуіцкі касьцёл Сьв.Станіслава. У 2005-м спаўняецца 50 гадоў з таго часу, як на Рынку быў выбух. А потым зьнішчылі гандлёвыя рады. (Іх можна ўбачыць у фільме «Першыя выпрабаваньні» паводле трылёгіі Якуба Коласа. Здымак фрагмэнту маецца ў Энцыклапэдыі літаратуры і мастацтва.) Горад, як піша Беларуская энцыкляпэдыя, быў пазбаўлены архітэктурнае дамінанты, затое бальшавікі зрабілі плошчу для дэманстрацыяў у «рэвалюцыйныя даты». Потым паставілі арыгінальны стод Леніна. Яго арыгінальнасьць у тым, што ўвечары, калі глядзець на помнік пры штучным сьвятле з пэўнага боку, ствараецца ўражаньне, што паміж ног правадыра нештачка зьвісае.

## Старыя вуліцы і камяніцы

Нясьвіж, Горадню, іншыя гарады Заходняе Беларусі бальшавікі таксама пакалечылі, але Пінск найбольш. Колькі будзе стаяць горад, гэтулькі ўспамінацьмуць пра касьцёл Сьв.Станіслава. Трэба пастарацца і да чорнае даты «ўвекавечыць» імёны герастратаў — тых, хто прымаў рашэньне пра зьнішчэньне сьвятыні, і тых, хто яго выконваў.

Іду па Касьцюшкоўскай (дагэтуль Леніна). Я памятаю прыгожы брук з васьмікутных плітак на гэтай вуліцы і на Берасьцейскай. Яго залілі асфальтам. Разбурылі старыя будынкі, каб вывесьці на Касьцюшкоўскую звыроднае крыло гатэлю (яго стары фасад — на набярэжнай). Вуліца Янкі Купалы па-ранейшаму не брукаваная. Добра, што не разьежджаная і падсохла. Не шанцуе нашым клясыкам у Пінску. Праяжджаў у аўтобусе міма дому, у якім настаўнічаў Якуб Колас. Цяжкое відовішча...

Выходжу на заасфальтаваную вуліцу жалезнага Фэлікса, а зь яе — на Чарняхоўскага. Бліжэй да цэнтру гораду захаваліся колькі старых аднапавярховых мяшчанскіх камяніцаў. Люблю іх, сьведчаньні былое заможнасьці.

Ну вось і помны з малалецтва суплёт вуліцаў Завальнае, Берасьцейскае ды Чарняхоўскага (ня ведаю, як звалі яе раней). Відзён гмах езуіцкага калегіюму. Даўно-даўно хадзіў я па яго драўляных лесьвіцах, па прыступках, акаваных сталёвымі вугольнікамі. Помніцца рэха — ад крокаў, галасоў... Тады я ня ведаў яшчэ, што сярод пінскіх езуітаў быў сьвяты Андрэй Баболя, якому, праўдападобна, Купала прысьвяціў два свае творы. Ня ведаў, што пад гэтымі скляпеньнямі хадзілі біскуп Жыгімонт Лазінскі, Купалаў дабрадзей ксёндз доктар Фабіян Абрантовіч, сэмінарыст духоўнае сэмінарыі імя сьв.Тамаша Аквінскага Казімер Сьвёнтак. І не здагадваўся, што аднакурснікі зь філязофскага аддзяленьня БДУ і Алесь Разанаў будуць клікаць мяне Тамашом — за захапленьне сыстэмаю анёльскага доктара.

## Каханы горад як люстэрка

— Як жывём? — паўтарае таварыш маё пытаньне. — Як і ўся краіна. Маладыя зьяжджаюць.

— А куды едуць?

— У Польшчу, у Расею. А што тут рабіць? Вось жонка. Тры дні працуе, чатыры гуляе. Няма працы.

Дрэнныя справы ў краіне і горадзе, калі ўласьнікі і прадпрымальнікі пачынаюць баставаць. Спрабуем уявіць карціну такога страйку ў міжваенным Пінску. Нічога не выходзіць. А ў сучасным Пінску такі страйк — адзіны паратунак ад сваволі ўлады. Мой таварыш — актыўны ўдзельнік гэтых акцыяў.

Лукашэнка ведае, што яму будзе finis, калі выбухне Менск, таму падкормлівае рабочую клясу сталіцы. А раз так — урад абабірае пэрыфэрыю, найперш вёску, потым — гарады. Сярэдні заробак у Беларусі складае недзе 115 «амэрыканскіх рублёў». У Пінску ж ён будзе разы ў два меншы. Не магу паверыць: а як жа людзі жывуць?

Так і жывуць, кажуць мне. Народ запалоханы. Кожны баіцца страціць нават малааплатную працу. Таму рэвалюцыі чакаць ня трэба. А выбары? Дэмакратычных кандыдатаў з дыстанцыі не здымалі, але другі тур галасаваньня правялі ў рабочы дзень. Хто ж гэта пакіне працу, каб сядзець назіральнікам на выбарчым участку? А незалежны друк, як і ў сталіцы, у Пінску душаць. Голас журналіста Аляксея Дзікавіцкага чуваць цяпер у беларускай і расейскай праграмах радыё «Свабода». Пінскія начальнікі гатовыя сабе локці кусаць, што не пасьпелі яго арыштаваць. Але і ва ўладзе бываюць някепскія людзі: вось жа Аляксея папярэдзілі...

Выходзім з будынку. Нас агортвае змрок. Толькі таго й сьвятла, што з дамоў, з кватэраў. Адзіны ліхтар цьмяна сьвеціцца ў канцы вуліцы.

— Гэта вам у Менску наладзілі ілюмінацыю, а тут пасьля заходу сонца ногі паламаць можна, — кажа даўні знаёмец.

Вуліцы Пінску — гэта асобная тэма. Іх параўноўваюць з пральнаю дошкаю. Я не згаджаюся. «Пральная дошка» — у Клецку ці то ў Нясьвіжы. Там дробненька трасе. А ў Пінску на Верасах гэтак можа страсянуць, што аж у сярэдзіне ёкае, што аж «пасажыры шафяругу клянуць».

— Каго-каго?

— Не кіроўцу, што за рулём сядзіць, яны клянуць, а Шафяругу. Мянушка такая.

— Чыя мянушка?

— А вось і ня скажам. У каго іншага папытайся.

Пінскае дураломства цяпер дэманструецца ўсяму сьвету. Ад таго часу, як галава беларускіх рыма-каталікоў застаўся ў Пінску, у горад прыяжджае нямала замежнікаў, а вуліца ля дому Яго Эмінэнцыі незабрукаваная.

## Кардыналаў клопат

Зноў ідзём па Касьцюшкоўскай. Па цёмнай Касьцюшкоўскай да касьцёлу Караля Барамея. Калі я быў школьнікам, у касьцёле захоўвалі балёны з газам...

Пільна ўзіраюся пад ногі. Чамусьці згадваецца радок зь Міхася Стральцова: «Змрок у палях, там сіберна і пуста».

На гэтай вуліцы, акрамя францішканскага касьцёлу, стаіць яшчэ палац Бутрымовіча. Палацам яго называюць у даведніках, а пінчукі кажуць — дом Бутрымовіча. Пабудаваны ў канцы 1780-х дойлідам Каралем Шыльдгаўзам для пінскага старасты Мацея Бутрымовіча, які, між іншым, кіраваў і будаўніцтвам Каралеўскага (Мухавецкага) каналу, палацык гэты за маёй памяцьцю быў Домам піянэраў і школьнікаў. Недзе ў канцы 1970-х яго ўзяліся ці то рамантаваць, ці то рэстаўраваць. Згадваю пра гэта, каб параўнаць стаўленьне да помнікаў дзяржавы і Царквы. Для касьцёлу і дому Бутрымовіча прывезьлі дахоўку аднагачасова. Дык ксёндз Сьвёнтак знайшоў работнікаў і хутка перакрыў сьвятыню, а дахоўку для палацу раскралі, і давялося крыць яго бляхаю. Дом і цяпер не даведзены да ладу, грунтавыя воды пачалі яго падмываць.

А можна было б аддаць гэты дом пад рэзыдэнцыю кардыналу, каб ён мог прымаць тут замежных гасьцёў, праводзіць канфэрэнцыі біскупаў. Царква хутка і якасна адрэстаўруе яго. І праблему з грунтавымі водамі вырашыць.

Выпускнік былое сэмінарыі імя сьв.Тамаша Аквінскага Казімер Сьвёнтак зрабіў вялікую справу: адnavіў сваю alma mater. Сэмінарыя беларуская. Месьціцца яна ў мурох францішканскага кляштару. На добры лад, Касьцёлу трэба было б вярнуць і былы езуіцкі калегіюм, ягоную ўласнасьць. За царом у рыма-каталікоў забралі бэрнардынскі кляштар з касьцёлам (цяпер там Варварынскі сабор з «цыбулінаю» і манастыр), дамініканскі касьцёл і кляштар (там быў Фёдараўскі сабор, потым кінатэатар «Дружба», а цяпер зноў узвышаецца праваслаўная царква; перабудаваная на ўсходні лад, яна сваёю архітэктураю і колерамі рэзка кантрастуе з асяроддзем). Саветы забралі ў рыма-каталікоў касьцёл Караля Барамея ды езуіцкі калегіюм з касьцёлам... Для сэмінарыі — першае самастойнае вышэйшае навучальнае ўстановы ў горадзе — і прыдаўся б гмах калегіюму.

Пінчукі ганарацца тым, што кардынал жыве ў іх, а ня ў Менску, што тут працуе вышэйшая сэмінарыя для амаль усяе Беларусі. Адна жанчына кажа:

— А ў Царкве так: дзе першы кардынал, там і наступны.

Людзі спадзяюцца, што Пінск і далей будзе сталіцаю рыма-каталікоў. Я падымаю вочы. У кляштары — на самым версе — сьвеціцца акно. Сьвятло ў змроку вечаровага Пінску.

# «Фэ» пінскім дарожным начальнікам

Мо хто з чытачоў «НН» ведае, якая служба адказвае за шчыты й указальнікі на дарогах? Поўнач роднага мне Пінскага раёну гэтая служба падзяліла на дзьве часткі: да Лагішына і пасьля Лагішына.

...За сьпінаю Ялowая, Ганцавіцкі раён. Адразу ж за вёскаю пачынаецца Пінскі. Першая паваротка — на мой родны хутар Доўгі Лес. На наступным паказальніку напісана «Заберезье». А яшчэ год таму было напісана па-беларуску.

У Бобрыку, адкуль мая прабабка, ніякіх паказальнікаў ня зьмецца. Затое ў Пласкіні чытаю: «Телехаңы», «Логишин». У Дабраславічах — «Логишин», «Лунинец». У Лышчы — «Юзефины», «Заборовцы»... (Забараўцы — родная вёска рэдактара «Народнай Волі» Іосіфа Сярэдзіча.) І ўжо няма сумневу, што ў Мокрай Дуброве прачытаю: «Стошаны». (Сташаны — радзіма паэты Анатоля Шушка. У Сташанах настаўнічаў паэта Мікола Купрэеў.) Нібыта беларуская зямля і людзей беларускай культуры дала, а вось бачыш ты, як абрусачылі за нейкі год.

Зь цяжкаю думаю ўяжджаю ў Лагішын зь яго манумэнтальна-пустым стадыёнам. Не, у Лагішыне паказальнікі беларускія. І так далей... З радасьцю бачу: напісана Парэчча (Скірмунтаў парк, школа, у якой вучылася Жэня Янішчыц), Моталь (радзіма мітрапаліта Мікалая).

І хто ж дадумаўся памяняць паказальнікі на поўначы ад Лагішына? Нарадзілася ў мяне думка: а што калі загітаваць Сярэдзіча, Прыгодзіча, Шушка ды іншых землякоў і разам сказаць пінскім дарожным начальнікам «фэ»?

# Анатоль Лябедзька:
# Мы спынілі канвэер сьмерці

**Лідэр Аб’яднанай грамадзянскай партыі Анатоль Лябедзька за апошні год пабываў і пад прэсінгам уладаў (папярэджаньне ад КДБ), і пад крытыкай правых (маладафронтаўцы зьбіралі яму грошы на квіток да Масквы). Нягледзячы на гэта, лібэрал Лябедзька застаецца поўны энтузіязму, а ягоная партыя шчыльна займаецца падрыхтоўкай да будучых выбараў. Патэнцыйны кандыдат ад апазыцыі на выбарах-2006, А.Лябедзька адказвае на пытаньні карэспандэнта «НН».**




IREX-PROMEDIA

**«НН»: Як Вы ставіцеся да ініцыятывы «За дастойнае жыцьцё» і ці бачыце ў яе палітычныя пэрспэктывы?**

**Анатоль Лябедзька:** Мы разглядаем іх як патэнцыйнага партнэра. Былі сустрэчы з кіраўнікамі ініцыятыўнай групы. Усё будзе залежаць ад таго, якую канцэпцыю яны прымуць: быць над працэсам ці часткай працэсу. Наагул, на сёньня ім няма дзе падзецца, як плыць да нашага берагу… Ініцыятыва можа быць удалай, калі будзе прыцягваць новых людзей, а не сяброў ужо існуючых арганізацый. Ад гэтага ніхто не выйграе.

**«НН»: Калі не лічыць пераходу ў апазыцыю часткі дэпутатаў Нацсходу, што яшчэ можна вылучыць у дзейнасьці апазыцыі ў мінулым палітычным сэзоне?**

**А.Л.:** Гэта пытаньне дыскусіі, якая будзе цягнуцца да агульнай перамогі. Можна разважаць так: не перамаглі таталітарны рэжым — значыць, нічога ня вартая нашая дзейнасьць. Але трэба ўлічваць і тое, што за восем гадоў створаная сыстэма, якая функцыянуе ўжо і без сэлектарных нарадаў Аляксандра Рыгоравіча... Дыскусійна цяпер называць АГП «апазыцыйнай» партыяй, бо мы падзяляем пазыцыю і падыходы 70—75% насельніцтва. Разам з гэтай часткай грамадзтва мы большасьць.

**«НН»: Ці будзе апазыцыйная кааліцыя на выбарах 2004 г.?**

**А.Л.:** Двухбаковыя кансультацыі ідуць. Вядучыя дэмакратычныя партыі здольныя аб’яднаць намаганьні ў фармаце некалькіх кампаній. Першая — «За свабодныя і справядлівыя выбары» — стартуе перад парлямэнцкімі выбарамі. У найбліжэйшы час 4-5 палітычных партый і шэраг грамадзкіх арганізацыяў выйдуць са зваротам у Канстытуцыйны Суд. Дэмакратычныя партыі і іх кіраўніцтва пазытыўна ставяцца да ідэі адзінага сьпісу на выбары. Калі мы пройдзем усе гэтыя прыступкі, зьявіцца плятформа для палітычнай кааліцыі. Важна супольна дамагчыся зьменаў заканадаўства, арганізаваць ціск унутры краіны і звонку на рэжым, каб ён лібэралізаваў умовы правядзеньня парлямэнцкіх выбараў. Праз гэтую сумесную працу мы можам выйсьці на рэальную кааліцыю, а не наадварот.

Калі ж будзе некалькі дэмакратычных сьпісаў, дык прайграем мы ўсе. Звычайнаму выбаршчыку складана разабрацца, чым розьніцца адзін дэмакратычны сьпіс ад другога.

**«НН»: Улада займаецца стварэньнем ідэалягічнай вэртыкалі. Для чаго яна патрэбная?**

**А.Л.:** Сытуацыя зьмянілася. За Лукашэнкам цяпер — усяго 25% прыхільнікаў. Гэта ўжо крытычная рыса. Таму Лукашэнка спрабуе знайсьці як мага больш такіх мініквазілукашэнкаў і прымусіць іх працаваць так, як працуе ён. Але ён згубіў людзей, якія яму давяралі, а вярнуць страчаную любоў складана.

**«НН»: На мінулым зьезьдзе АГП Вы абвесьцілі, што ўлада рыхтуе рэфэрэндум. Прайшоў год. І дзе рэфэрэндум?**

**А.Л.:** Пагроза рэфэрэндуму захоўваецца. Але ёсьць некалькі фактараў, якія не даюць Лукашэнку зрабіць адмашку. Па-першае, рэфэрэндум у сёньняшніх умовах аб’ядное ўсіх апанэнтаў рэжыму. Па-другое, Лукашэнка да сёньняшняга дня так і не атрымаў палітычнай падтрымкі з боку Крамля.

**«НН»: Існуе думка, што адносіны паміж Крамлём і Лукашэнкам заўсёды добрыя, а ўсе непаразуменьні паміж імі — тактычныя, а не стратэгічныя...**

**А.Л.:** Лукашэнка не гуляе, яго выступ, прысьвечаны стварэньню новай ідэалёгіі, поўны жорсткай крытыкі Расеі. Паміж Лукашэнкам і Пуціным даволі вялікая дыстанцыя. Яны не сышліся на ўзроўні чалавечых адносінаў. Разам з тым Расея стратэгічна зацікаўленая ў Беларусі. Але сёньня яна ня здольная ні купіць Беларусь, ні захапіць яе.

**«НН»: Якая мэта новага наступу ўладаў на недзяржаўныя арганізацыі Беларусі: «Ратушу», «Грамадзянскія ініцыятывы», «Варуту»?**

**А.Л.:** Гэта таксама падрыхтоўка да выбараў і мажлівага рэфэрэндуму. Зарэгістраваныя арганізацыі могуць займацца легальнай грамадзкай і, у пэўнай ступені, палітычнай дзейнасьцю. Падчас выбарчых кампаній грамадзкая арганізацыя мае права вылучаць наглядальнікаў на ўчасткі — мець невялічкі кантроль над працэсам. Таму ва ўладаў і зьявілася патрэба правесьці «зачыстку». Прычым удар наносіцца па ключавых, уплывовых.

**«НН»: Якім чынам павінен быць вызначаны кандыдат ад дэмакратычных сілаў на прэзыдэнцкія выбары 2006 г.?**

**А.Л.:** Ня так, як было падчас апошняй прэзыдэнцкай кампаніі. Галоўны недахоп — тады мы не дамовіліся пра працэдуру абраньня.

АГП будзе вылучаць кандыдата на прэзыдэнцкія выбары 2006 г. Але мы будзем гэта рабіць зноў жа праз працэдуру. І на першым этапе можа быць некалькі патэнцыйных «кандыдатаў у кандыдаты». Лава такіх прэтэндэнтаў у нас доўгая. Ідэальны варыянт — правядзеньне т.зв. папярэдніх выбараў. Да чаго гэта прывядзе, мы пакуль ня ведаем. Калі плёну ня будзе, тады партыя выставіць кандыдата самастойна.

**«НН»: Калі такім кандыдатам стане Анатоль Лябедзька, якімі будуць галоўныя пункты ягонай плятформы?**

**А.Л.:** Калі гэта будзе кандыдат ад АГП, ня трэба будзе прыдумляць праграмы. У нас ёсьць эканамічная праграма, праекты пэнсійнай рэформы, рэформаў жыльлёва-камунальнай гаспадаркі, падатково-бюджэтнай сыстэмы, арміі.

**«НН»: Напярэдадні мінулых прэзыдэнцкіх выбараў апазыцыя страціла шэраг лідэраў. Ці можа зноў узьнікнуць фізычная небясьпека для галоўных апанэнтаў рэжыму?**

**А.Л.:** Нас гэта закранае найбольш, бо Карпенка, Захаранка і Ганчар былі сябрамі АГП. Адным з галоўных вынікаў кампаніі «Хочам ведаць праўду» сталася тое, што мы спынілі «канвэер сьмерці». Але з патэнцыйным кандыдатам можа здарыцца ўсё што заўгодна: ён можа зьнікнуць, памерці, праз дзяржаўныя СМІ яго могуць прадставіць як «наркамана» ці «крымінальніка». Разам з тым мы разумеем: каб «раскруціць» кандыдата, яго каманду і праграму, трэба час. Давядзецца рызыкаваць.

**Гутарыў Сяргей Ёрш**

# «Ратуша» адраклася рызографа

**Быць павешаным «на першым жа ліхтары» — ліст з такой пагрозай атрымаў у чацьвер Аляксандар Мілінкевіч, кіраўнік гарадзенскага грамадзкага аб’яднаньня «Ратуша».**



АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

Пасланьне з пагрозамі падпісанае нейкім Расейскім нацыянальным саюзам. Сам А.Мілінкевіч ацаніў яго як запалохваньне і жаданьне перашкодзіць абароне «Ратушы», якую ўлады спрабуюць зачыніць. Пазоў грунтуецца на двух папярэджаньнях. Першае «Ратуша» атрымала год таму, другое — у мінулым месяцы. Маўляў, парушаныя правілы захоўваньня і выкарыстаньня рызографу, якім яна валодае. «Ратуша», сапраўды, ня мае адпаведнай ліцэнзіі. Аднак Палажэньне аб ліцэнзаваньні паліграфічнай дзейнасьці датычыць толькі суб’ектаў гаспадараньня. Грамадзкія арганізацыі ў ім ня згадваюцца. Да таго ж, цяпер сход заснавальнікаў «Ратушы» вырашыў бясплатна перадаць рызограф Гарадзенскаму ўнівэрсытэту.

Асамблея няўрадавых арганізацый, у сваю чаргу, 3 траўня распачала акцыю «Наша салідарнасьць». 16 арганізацый, у тым ліку Фонд Сапегі, Беларуская асацыяцыя журналістаў, ПЭН-Цэнтар, Праваабарончы цэнтар «Вясна», магілёўскі цэнтар «Кола сяброў», зьвярнуліся ў Мінюст з прапановаю прыпыніць працэдуру ліквідацыі «Ратушы», баранавіцкае «Варуты», вакол якіх віравала грамадзкае жыцьцё ў іхных рэгіёнах, а таксама Моладзевага хрысьціянска-сацыяльнага саюзу. АНА прапанавала таксама правесьці круглы стол з удзелам прадстаўнікоў уладаў і «трэцяга сэктару». Да акцыі салідарнасьці далучыліся таксама найбуйнейшыя польскія грамадзкія арганізацыі. Рэакцыі зь Міністэрства пакуль няма, затое ў Гомелі ўлады паведамілі пра ліквідацыю аналягічнага гомельскага рэсурсавага цэнтру «Грамадзянскія ініцыятывы».

Карэспандэнт «НН» гутарыць з Алесем Мілінкевічам.

**«НН»: Ці ўратуюць гэтыя дзеяньні «Ратушу» ад закрыцьця?**

**А.М.:** Гэта быў бы цуд. У Беларусі не было аніводнага выпадку, калі б грамадзкая арганізацыя вылузалася з рук уладаў, якія хочуць яе зьнішчыць. Наўрад ці ў Горадні будзе іначай. Але мы будзем бараніцца, бо перакананыя: абарона «Ратушы» дапаможа адстаяць іншыя арганізацыі. Мы накіроўваем у суд тлумачэньне, у якім падкрэсьліваем, што падставы, якія ўпраўленьне юстыцыі лічыць дастатковымі для ліквідацыі «Ратушы», надуманыя.

**«НН»: Чаму менавіта цяпер на вас «наехалі»?**

**А.М.:** Улада імкнецца, каб была адна партыя, адна рэлігія, адна моладзевая арганізацыя, адзін прафсаюз. У гэтым сэнсе мы не адпавядаем дзяржаўнай палітыцы.

**«НН»: Як сытуацыя будзе разьвівацца далей?**

**А.М.:** Я не магу сказаць, зачыняць улады толькі гэтыя арганізацыі ці нас чакае гвалтоўнае зьнішчэньне ўсяго трэцяга сэктару. Залежаць будзе ад таго, як грамадзкія арганізацыі адрэагуюць на гэты прэсынг. Вельмі важна, ці будуць яны цяпер азірацца на ўладу. Што тычыцца «Ратушы», дык нам могуць забараніць карыстацца назвай, пячаткай, рахункам, але людзі застаюцца. Закрыцьцё «Ратушы» прынясе ўладзе больш шкоды, чым карысьці.

**ПМ, Горадня**

# Стракацень беларускіх СМІ



IREX-PROMEDIA

На выставе каля стэнду «праваслаўнай» «Звязды» салам і бульбай частуюцца віцэ-прэм'ер Уладзімер Дражын (зьлева) і намесьнік кіраўніка прэзыдэнцкай адміністрацыі Алег Праляскоўскі (справа). У цэнтры — галоўны рэдактар газэты «Звязда» Ўладзімер Наркевіч.

На выставе «СМІ ў Беларусі», якая прайшла 7—10 траўня ў Менску, было шмат экспазыцыяў і багата наведнікаў. Выстаўлялі сваю прадукцыю як дзяржаўныя, так і недзяржаўныя мас-мэдыі. Што праўда, сур'ёзная прэса была рэпрэзэнтаваная пераважна дзяржаўным сэктарам — «Звязда», «Беларусь сегодня» і да т.п. Зь незалежных газэтаў узяла ўдзел толькі «БДГ», прычым адразу ў дзьвюх іпастасях — як проста «БДГ» і як «БДГ — Для служебного пользования». Заўважныя былі і бокс агенцтва «БелаПАН», якое рэклямавала сваё выданьне «Отдыхай», і інтэрнэт-рэсурс naviny.by. Дэманстрацыйна адмовіліся ад удзелу «Народная воля» і «Белорусская газета», бо арганізатары запрасілі завялікую, на іхную думку, суму. Няцяжка падлічыць: найменшы бокс (плошчай у 6 кв.м) каштаваў 600 даляраў.

Аднак нават такія кошты не перашкодзілі ўдзельнікам цалкам запоўніць велічэзную залю выстаўнага комплексу «Белэкспа». Самыя вялікія пляцоўкі пазаймалі электронныя СМІ — Белтэлерадыёкампанія, тэлеканалы АНТ і СТВ. З папяровых мас-мэдыяў вылучаліся даўжэзнымі пуставатымі стэндамі «Беларусь сегодня», «Звязда», а таксама два холдынгі — «Літаратура і мастацтва» ды «Культура і мастацтва». «Звязда», апрача ўсяго, зьдзівіла яшчэ й назвай фотавыставы — «Беларусь праваслаўная». Гэта ўсё ў рэчышчы новай дзяржаўнай рэлігійнай палітыкі?

## І жук і жаба

Сярод беларускіх выданьняў — удзельнікаў форуму сустракаліся зусім невядомыя. Ці чулі вы пра газэту для жанчынаў «Будуар» альбо маладзёвае выданьне «НаблюДАтель»? Гэткімі ж незнаёмымі былі прэзэнтаваныя на выставе СМІ Ўкраіны, Кітаю ды большая частка расейскіх. Шырокаму прадстаўніцтву кітайскіх мас-мэдыяў перашкодзіла эпідэмія атыповай пнэўманіі. Але якая эпідэмія замінала ўкраінскім СМІ? Іхная экспазыцыя на выставе падавалася бязладна сабранай зь першага-лепшага, што трапіла пад руку супрацоўнікам украінскай амбасады. Газэты камуністычныя й нацыяналістычныя, часопісы культурніцкія, пэдагагічныя ды прысьвечаныя дрэваапрацоўцы ляжалі ўперамежку.

Расейскія СМІ былі прадстаўленыя найбольш. Была выстава «СМІ Маскоўскай вобласьці», асобна стаяла выстава нейкага выдавецтва зь Ніжняга Ноўгараду. Вылучаліся кампаніі, арганізаваныя афіцыёзнаю «Российской газетой» ды «Литературной газетой», якую, паводле некаторых чутак, «прыкормліваюць» беларускія фонды. І сапраўды, «Литературная» бясплатна раздавала выпуск зь беларуска-расейскім дадаткам «Лад» (ён выходзіць раз на месяц на чатырох старонках гэтага выданьня). Уся беларуская частка дадатку была аддадзеная творцам, блізкім да ўлады (Алесю Каждубу, Раісе Баравіковай, Віктару Гардзею ды інш.), і рэклямавала ідэі беларуска-расейскай інтэграцыі. Такая вось культурная інтэграцыя.

## Фота зь дзьвюма Аленамі Сьпірыдовіч

Прэзэнтацыі — тая «разынка», якой бракавала многім удзельнікам выставы. Але тэлекампаніі (тры беларускія плюс тэлерадыёкампанія «Мір») ды некаторыя газэты зладзілі для наведнікаў цэлыя канцэрты. Найбольш «зорак» сабралася на пляцоўцы Першага нацыянальнага: усе папулярныя вядоўцы (кшталту Алены Сьпірыдовіч і Сяргея Кухто), музыкі (Лявон Вольскі, Алег Елісеенкаў) і г.д. Тутсама стаялі кардонныя муляжы вядомых вядоўцаў (той самай А.Сьпірыдовіч, Аляксандра Дамарацкага ды іншых), зь якімі можна было сфатаграфавацца. Найбольш спрытныя пасьпявалі зьняцца ў кампаніі з копіяй ды арыгіналам. «Тэлезоркі» ахвотна пагаджаліся на такія здымкі.

Ня менш славутасьцяў было і на прэзэнтацыі Беларускага радыё. Вершы чыталі Леанід Дранько-Майсюк і Андрэй Хадановіч, сьпяваў гурт «Камэрата».

Свой «эксклюзіў» — Аляксандра Ціхановіча ды Іну Афанасьеву — прадстаўляў тэлеканал СТВ. Каля стэнду «Звязды» цешыліся аматары сярэднявечнае музыкі: тут граў гурт «Стары Ольса». Прэзэнтацыю газэты «Беларусь сегодня» асабіста вёў рэдактар Павал Якубовіч. З запрошаных ім гасьцей асабліва ўразіў струнны квартэт Інстытуту сучасных ведаў: творы Вівальдзі, Грыга ды Хачатурана ня надта адпавядалі атмасфэры, якая панавала навокал. Дзяўчат практычна не было чуваць: на суседняй пляцоўцы Белтэлерадыёкампаніі надрываўся А.Елісеенкаў. Ён рэклямаваў «першую беларускую эратычную песьню» і заглушаў усіх навокал. Відаць, зразумеўшы, што вылучацца такім чынам з агульнага шэрагу няёмка, П.Якубовіч пасьля струннага квартэту абвясьціў «сьпявачку Ўльяну», якая зацягнула нешта дужа папсовае.

## АНТ правяло кастынг

Прэзэнтацыі СМІ адбываліся адначасова і перашкаджалі адна адной. Так, выступы на пляцоўцы тэлерадыёкампаніі «Мір» пэрыядычна заміналі самаму, бадай, актыўнаму ўдзельніку выставы — тэлеканалу АНТ. Даводзілася «АНТшнікам» раз-пораз прасіць калегаў прыцішыць гук.

Хто-хто, а АНТ сваю прэзэнтацыю падрыхтавала ўзважана й густоўна: Дзяржаўны ансамбль «Песьняры», спартовы тэатар Яўгенії Паўлінай, рок-гурт «The Stokes», прэзэнтацыя абноўленага сайту тэлеканалу. Але «фішкай» стаўся адкрыты кастынг вядоўцаў: цягам трох дзён усе ахвотныя маглі паспрабаваць свае сілы ў якасьці дыктараў тэлеканалу. Свой адбор ладзіў і Першы нацыянальны, але там конкурс доўжыўся толькі дзень. «Мы не чакалі, што будзе такі ажыятаж», — прызналася рэжысэрка АНТ Натальля Язоўскіх. Ахвотных толькі за гэтыя дні запісалася больш за 300 чалавек.

## Заміж пастскрыптуму

Адзінае, што падалося не зусім дарэчным на выставе, — час правядзеньня. Разумею, што паводле савецкай завядзёнкі і Дзень друку, і Дзень работнікаў радыё і тэлевізіі адзначаюцца на пачатку траўня. Аднак лягічней было б аднесьці гэты форум на канец жніўня — пачатак верасьня. І да Дня беларускага пісьменства бліжэй, і тэлеканалы маглі б больш актыўна й свабодна рэклямаваць навінкі сэзону.

**Аркадзь Шанскі**



IREX-PROMEDIA

# Ягор Хрусталёў: Беларускае вяшчаньне на АНТ дасягне 80%

**Плянамі тэлеканалу на наступны сэзон падзяліўся з «НН» праграмны дырэктар АНТ Ягор Хрусталёў.**

**«НН»: *Для якіх перадачаў адбіраеце вядоўцаў?***

**Я.Х.:** У нас ёсьць некалькі новых праектаў, якія пачынаюцца з восені. І ў якасьці вядоўцаў, і ў якасьці гэроя гэтых перадачаў патрабуецца вялікая колькасьць людзей, якія разьнявалена пачуваюцца перад тэлекамэрай, якія любяць тэлевізію. Мы атрымалі тут велізарны банк зьвестак: імёны, адрасы тых, хто хацеў бы трапіць на тэлевізію і пагаджаецца дзеля гэтага на такое выпрабаваньне, як кастынг. Самы вялікі плюс нашага ўдзелу ў выставе — тое, што мы здолелі правесьці такую работу.

**«НН»: Наколькі пашырыцца беларускае вяшчаньне на АНТ?**

**Я.Х.:** Падам такі прыклад. Аналягічны нашаму ўкраінскі тэлеканал «Інтэр» пачынаў з таго, што меў 20% уласнага вяшчаньня, а на 80% — канал ОРТ. Сёньня ў іх расейскае вяшчаньне рэальна складае ня больш за 20%, а астатняе — арыгінальныя перадачы.

**«НН»: Новыя праграмы, якія рыхтуе АНТ, ствараюцца на аснове замежных (расейскіх, эўрапейскіх, амэрыканскіх) узораў ці гэта ўласныя распрацоўкі?**

**Я.Х.:** Гэта будуць арыгінальныя беларускія праекты. Яны грунтуюцца на новых тэлевізійных тэхналёгіях і адлюстроўваюць новы падыход. На вялікі жаль, я ня маю маральнага права распавядаць канкрэтна пра гэтыя праекты: усе яны альбо ліцэнзійныя, альбо робіцца намі сумесна зь іншымі кампаніямі. Тэлеканалаў сёньня многа, існуе канкурэнцыя, і вельмі лёгка загубіць праект.

**«НН»: Калі на АНТ зьявіцца беларуская мова?**

**Я.Х.:** На маю асабістую думку, было б цудоўна, каб на ток-шоў «Выбар» хоць бы 4-5 гасьцей маглі нармальна і якасна гаварыць па-беларуску. Калі чалавек толькі робіць выгляд, што ведае мову, а сам гаворыць з памылкамі, дык у іншых складаецца ўражаньне, што мова непрыгожая, у гледачоў адбываецца адпрэчваньне мовы. Ток-шоў «Выбар» глядзяць паўтара мільёна чалавек. Уявіце, што туды пройдзе чалавек, які будзе скажаць мову, — гэта значна горш, чым тое, што мы гаворым па-расейску.

У нас моцна адчуваецца экспансія расейскіх электронных СМІ, бо мы жывём у атачэньні расейскіх тэлеканалаў. Чым хутчэй мы авалодаем уласнай інфармацыйнай прасторай, тым хутчэй зможам там ствараць і ўласную моўную прастору.

**АШ**

# Захоп «Норд-Осту» быў санкцыянаваны ГРУ?

**Сярод чачэнскіх тэрарыстаў, якія захапілі 800 закладнікаў у маскоўскім Тэатральным цэнтры на Дуброўцы, быў прынамсі адзін агент расейскіх спэцслужбаў. І ён пакінуў будынак за дзень да штурму. Вынікі расьследаваньня журналістаў расейскае «Новой газеты».**



АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

25 красавіка сайт расейскай газэты «Известия» паведаміў, што дэпутата Думы Сяргея Юшанкова маглі забіць за тое, што ён атрымаў доказы датычнасьці ФСБ да тэракту ў маскоўскім Тэатральным цэнтры на Дуброўцы. Такую інфармацыю распаўсюдзіў Аляксандар Літвіненка (былы падпалкоўнік ФСБ, які ўцёк на Захад, пасьля таго як адкрыў Барысу Беразоўскаму, што атрымаў заданьне яго забіць). Паводле словаў Літвіненкі, у пачатку красавіка на сустрэчы ў Лёндане ён перадаў Юшанкову інфармацыю пра нейкага Ханпаша Церкібаева. Гэты чалавек, які быў шмат гадоў агентам ФСБ, знаходзіўся ў «Норд-Осьце» разам з тэрарыстамі і пакінуў будынак перад штурмам.

Церкібаеў, паводле прэс-рэлізу, быў уведзены ў асяродак чачэнскіх баевікоў для арганізацыі правакацыяў. Ён пачаў працаваць на ФСБ, калі быў журналістам на Грозенскім тэлебачаньні. У канцы 2000 г. перайшоў у прэсслужбу Аслана Масхадава, а ў пачатку 2001 г., адпаведна з заданьнем расейскіх спэцслужбаў, — у адзін з атрадаў баевікоў. Паводле Літвіненкі, цяпер Церкібаеў знаходзіцца ў атачэньні Маліка Сайдулаева — прамаскоўскага чачэнскага лідэра, блізкага да спэцслужбаў. Церкібаеў, у якасьці «прадстаўніка чачэнскай грамадзкасьці», суправаджаў спэцпрадстаўніка прэзыдэнта Расеі Дзьмітрыя Рагозіна на сэсіі ПАРЭ ў Страсбургу 31 сакавіка.

28 красавіка расейская «Новая газета» апублікавала інтэрвію журналісткі Ганны Паліткоўскай з Ханпашам Церкібаевым.

## «Вось я і Маргарэт Тэтчэр»

Ханпаш — удзельнік абсалютна ўсяго. «Хлопец на ўсе выпадкі нашай палітыкі, — піша Паліткоўская. — З усімі знаёмы, усюды прыняты, зь ім па плячы любыя павароты на Паўночным Каўказе. З Масхадавым спатрэбіцца пагуляць — ён зьвядзе з Масхадавым. Без Масхадава — ён таксама забясьпечыць. Так, прынамсі, запэўнівае». Афіцыйна ён працуе спэцыяльным карэспандэнтам «Российской газеты», афіцыйнага ўрадавага выданьня. Яшчэ ён запэўнівае, што рэгулярна сустракаецца з памочнікам Пуціна Сяргеем Ястржэмбскім: «Я ў яго працую. Вось мы на фатаграфіі зь ім».

Ястржэмбскі на здымку глядзіць міма камэры і падаецца вельмі нездаволеным. Затое Ханпаш утаропіўся проста ў аб’ектыў: вось, маўляў, мы разам. Фота выйшла з настроем: заўважна, як ня трэба яно было Ястржэмбскаму і як, па ўсім відаць, настойваў на ім Церкібаеў. Ёсьць у яго і іншыя здымкі: «Я і Масхадаў, я і Ястраб, яшчэ раз — я і Масхадаў, я ў Крамлі, я і Сайдулаеў, я і Хіль Роблес (эўрапейскі камісар па правах чалавека)…» Добрая палова картачак здаецца грубаватым мантажом. (Потым праверылі ў спэцыялістаў — так і ёсьць). Ханпаш не тушуецца, дастае «сябе з Маргарэт Тэтчэр і Масхадавым» — каб давесьці, што і зь Лёнданам блізка знаёмы. 1998 год. Масхадаў у папасе, выглядае так, як да вайны, а Ханпаш — так, як цяпер… На іншай картачцы — Ханпаш і Масхадаў часоў цяперашняй вайны. Масхадаў у камуфляжы, барада моцна пасівела, выглядае жудасна, дый Ханпаш — ня надта. Гэтая — сапраўдная.



**Ханпаш Церкібаеў— авантурыст і правакатар.**

## Амністыя за Будзёнаўск

Церкібаеў кажа, што паводле прафэсіі ён актор, скончыў акторскі факультэт Грозенскага ўнівэрсытэту. Няважна, што такога факультэту не было і ён сам так і ня здолеў прыгадаць, хто быў ягоным пэдагогам па акторскім майстэрстве. Галоўнае, што ён абвяшчае: з Ахмедам Закаевым «мы сябры, разам працавалі ў тэатры». У першую вайну Ханпаш узяў у рукі відэакамэру і зрабіўся тэлевізіёншчыкам. Хадзіў з Басаевым на Будзёнаўск, але за ўдзел у тым рэйдзе асуджаны ня быў. Наадварот — атрымаў амністыю ў красавіку 2000 г.

Паперы аб амністыі яму давалі ў Аргунскім гарадзкім аддзеле ФСБ Чачэніі — адным з самых жорсткіх. Якраз калі Ханпаша амніставалі, людзі адтуль выбіраліся хіба што на той сьвет. Церкібаеў — першы сустрэты жывым, дый яшчэ з даведкай аб амністыі за Будзёнаўск.

Паміж дзьвюма войнамі Ханпаш, як «герой Будзёнаўску», робіцца вядучым спэцыялістам прэс-службы прэзыдэнта Масхадава. У яго на канале Масхадава — аўтарская тэлепраграма «Прэзыдэнцкае сэрца», пазьней перайменаваная ў «Шлях прэзыдэнта». Потым Ханпаш вымушаны быў пайсьці з масхадаўскага атачэньня, але, як пачаліся баявыя дзеяньні, вярнуўся і зноў стаў «заўзятым джыгадыстам». Проста пад носам у фэдэральных войскаў і спэцслужбаў, пасярод цяжкіх баёў, калі ўсе беглі куды маглі, Ханпаш рабіў тэлепраграму, сэнс якой можна перакласьці з чачэнскай прыблізна так: «Мая радзіма там, дзе джыгад». «Я і тады, і цяпер так не лічу, — кажа ён. — Проста праграма ў мяне была такая».

Апошні ўзьлёт палітычнай кар’еры Ханпаша Церкібаева зьвязаны з 23—26 кастрычніка 2002 г. Пасьля «Норд-Осту» ён сапраўды зрабіўся «хаўрусьнікам» адміністрацыі Пуціна. Быў забясьпечаны ўсімі неабходнымі дакумэнтамі, каб бесьперашкодна перамяшчацца ўсюды дзе трэба, манэўруючы ад Масхадава да Ястржэмбскага. Вёў перагаворы ад імя адміністрацыі Пуціна з дэпутатамі чачэнскага парлямэнту — тыя спатрэбіліся для падтрымкі рэфэрэндуму. Дамовіўся. Выбіваў для гэтых дэпутатаў гарантыі недатыкальнасьці ў выпадку прыезду ў Маскву. Выбіў. Вазіў тых самых дэпутатаў, у якасьці кіраўніка групы, у Страсбург, у высокія габінэты Рады Эўропы і Парлямэнцкай асамблеі. І там дэпутаты паводзілі сябе выключна «правільна» — як трэба было Расеі.

«А вы самі пасьля галасавалі на рэфэрэндуме?» — пытаецца журналістка. «Я? Не, — сьмяецца. — Я з тэйпу «чарто», нас «яўрэямі» ў Чачэніі называюць».

## «Трэба проста пашумець»

Чаму менавіта Ханпаш? За якія такія паслугі? Чым ён давёў сваю вернасьць? Бо без адпаведных доказаў наўрад ці давяралі б яму такія «апэрацыі». З ўсяго відаць, менавіта Ханпаш і ёсьць той самы чалавек, якога ўсе ўцягнутыя ў трагедыю «Норд-Осту» так шукалі. Чалавек, які зьсярэдзіны забясьпечваў тэракт.

Журналістка пытаецца: «Ваша прозьвішча апублікаванае ў сьпісе тэрарыстаў, што былі ў «Норд-Осьце». Дарэчы, вы падавалі на гэтую публікацыю ў суд?» — «Не. А навошта? Я проста спытаўся Ястржэмбскага: «Як такое магло здарыцца?» — «І што ён адказаў?» — «Не зважай». Ён і сам не адмаўляецца, — славалюбец! — што быў засланы спэцслужбамі. Ён увайшоў у будынак разам з групай Бараева, у складзе атраду. Употай, як сам кажа, прывёз чачэнцаў і ў Маскву, і ў сам «Норд-Ост». Гэта ён пераконваў тэрарыстаў, што «ўсё пад кантролем», што «расейцы зноў узялі грошы», як тады, калі чачэнцы выходзілі з аточаных фэдэральнымі войскамі Грознага і Камсамольскага. Што трэба проста «пашумець» — каб выйшаў «другі Будзёнаўск», і такім чынам дабіцца міру. А потым, пасьля выкананьня заданьня, «нам дадуць сысьці» — ня ўсім, але дадуць. Гэтым «ня ўсім» выявіўся ён сам. На пытаньне, ці была ў баевікоў выбухоўка, Ханпаш катэгарычна адказвае: «Не».

Церкібаеў выйшаў з будынку, не чакаючы штурму. У яго, кажа, быў плян Тэатральнага цэнтру на Дуброўцы, якога не было ні ў Бараева, ні нават спачатку ў спэцназу, што рыхтаваўся да штурму. Бо Ханпаш — частка сілаў, куды вышэйшых у сілавой гіерархіі, чым «Віцязь» ды «Альфа». «Зрэшты, быў у яго той плян ці не было — па вялікім рахунку ўсё адно, — піша карэспандэнтка. — Сутнасьць у іншым: калі ў «Норд-Осьце» быў такі засланы агент, дык значыць, расейская ўлада (яе частка) ведала, што рыхтуецца тэракт. Удзельнічала ў яго падрыхтоўцы, і нават няважна, зь якой мэтай». Дык што ж за спэцслужбы падрыхтавалі такое нялюдзкае выпрабаваньне для расейскага народу? Церкібаеў на гэтае пытаньне адказваць не захацеў.

На другой чачэнскай вайне падобнымі мэтадамі дзейнічае вайсковая выведка. Запявалы ў так званых эскадронах сьмерці — супрацоўнікі ГРУ. Страты без судоў — іхнае рамяство. І ні ФСБ, ні МУС, ні пракуратура нічога зрабіць ня могуць. А ўдовы, што страцілі мужоў ад дзеяньняў «эскадронаў сьмерці», — дужа зручны матэрыял для запалохваньня ўсяго грамадзтва.

Практыка ня новая: гэтак спэцатрады НКВД ў вайну пераапраналіся немцамі ды палілі вёскі «ў тыле ворага», а па вайне забівалі людзей у Заходняй Украіне і Беларусі пад відам «бандэраўцаў». Падчас штурму «Норд-Осту» загінулі 129 чалавек. Тыя, хто выжыў, працягваюць паміраць ад перажытага стрэсу. А правакатар квітнее. Ён прыкормлены, добра выглядае і, галоўнае, пры справе. Днямі Ханпаш Церкібаеў кіруецца ў Чачэнію — як кажа сам, рыхтаваць «мірныя перамовы».

**Франц Субель**

## 12 траўня панядзелак

### БТ
6.00, 7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 18.00, 23.00 Навіны.
6.10, 7.10, 8.10 Добрай раніцы, Беларусь!
9.10, 17.05 «Тайны Ніра Вулфа». Сэрыял.
10.00 Плянэта АРТ.
10.25 Кліп-абойма.
11.05 «Габрыэль Шанэль». Дак. фільм.
12.15 Панарама: падзеі тыдня.
13.05 Тэлебаромэтар.
13.20 І.Мураўёва ў лірычнай камэдыі «Самая абаяльная і прывабная».
14.45 «Ішоў трамвай 10-ы нумар». Мультфільм.
15.15 «Не зявай!».
15.45 «Сузор'е надзей».
16.10 Мультыклюб.
18.15 «Гаспадары зямлі». Відэафільм АТН.
18.35 З дакладных крыніц.
18.50 Ж.Дэпардзье і Р.Палянскі ў дэтэктыве «Простая фармальнасьць».
20.40 Калыханка.
21.00 Панарама.
21.45 Навіны рэгіёну.
21.55 «Каралева сэрцаў». Сэрыял.
22.50 Зона Ікс.
23.15 Футбол. Чэмпіянат Беларусі. «Тарпэда-СКА» (Менск) — «Нёман» (Горадня). 2-ці тайм.
0.05 Начная размова.

### СТВ
5.30 Музычны канал.
6.00 «Накаўт». Навіны боксу.
6.30, 15.50 «Паўэр рэйнджэрз, ці Магутныя рэйнджэры».
6.55, 15.25 «Флінт — дэтэктыў у часе».
7.20 «168 гадзін».
8.05 «Менск і менчукі».
8.10, 22.50 «Тэхналёгія».
8.20 Камэдыя «Багі звар'яцелі?..».
10.15, 20.10 «Турпаход».
10.25 «Асабісты інтэрас».
11.00 «Архідэі Беларусі». Дак. фільм.
11.25 «Народ супраць».
12.00 «Віно каханьня».
12.55 «У нас усе дома».
13.30, 16.30, 19.30, 22.30 «24 гадзіны».
13.50, 18.35 «На рагу ля Патрыярхавых».
14.40 «Бітлборгі».
15.00 «Чалавек-павук».
16.45 «Дыялёг з усім сьветам»: «Шукальнікі золата».
17.50 «Меншчына. Людзі, падзеі, факты».
18.00 «Партрэт у інтэр'еры».
18.15 «Арт-экспрэс». Культурнае жыцьцё сталіцы.
19.50 «СТВ-спорт».
20.20 «Добры вечар, маленькі...».
20.40 «Адпачывай».
20.50 Баявік «Пасланец каралевы».
23.00 «Навіны СНД».
23.15 «Сталічны футбол зь Юр'ем Доўнарам».
23.35 Фільм жахаў «Пітон».

### Першы музычны канал
7.00 Пад'ёмнік.
9.00, 22.00 «120/80».
9.10, 16.00 Рухач.
14.00 «ІнтэрАктыў».
17.00, 18.45, 19.40, 22.10 УльтраМікс.
18.00 «Пра Fashion».
19.30 People-mix.
23.00 МэгаМікс.

### АНТ
8.00, 9.00, 18.00, 20.30, 22.45 Нашы навіны.
8.05 «Добрай раніцы».
9.05 Контуры.
9.45 «Зямля каханьня, зямля надзеі».
10.30 Каломба вяртаецца ў дэтэктыве «Паспрабуй, зразумей мяне».
11.40, 0.45 «Фабрыка зорак-2».
15.10 «Невядомая плянэта». Смак зьмяі.
15.40 Прыгодніцкі фільм «Над намі Паўднёвы крыж».
17.00 «Вялікае мыцьцё».
18.10 Лубянка. «Звычайны тэрарызм». Фільм 1-ы.
18.55 Чакай мяне.
20.00 Час.
21.00 Ток-шоў «Выбар».
21.45 Дэтэктыў «Жаночая лёгіка». 1-я сэрыя.
23.00 Дэтэктыў «Прыватная справа».

### РТР
7.45 Андрыяна Чэлентана і Арнэла Муці ў камэдыі «Па-вар'яцку закаханы».
9.45, 18.50 Весткі. Дзяжурная часьць.
10.00, 19.00 Весткі.
17.50 «Камісар Рэкс».
19.30 Мясцовы час. Весткі — Масква.
19.50 Дабранач, дзеці!
19.55 Тэлесэрыял «Ідыёт».
20.55 Тэлесэрыял «Людзі і цені-2».
22.00 Ток-шоў «Весткі+».
22.30 «Дзяжурны па краіне». Міхаіл Жванецкі.

### Культура
17.30 Навіны культуры.
17.50 «Парадак слоў». Кніжныя навіны.
17.55 Улада факту.
18.25 Сцэнаграма.
18.55 Гадзіна музыкі.
19.35 70-годзьдзе паэта. «Антысьветы Андрэя Вазьнясенскага».
20.15 Ж.Б.Мальер. «Лекар міжволі». Тэлеспэктакль.
21.25 «Тым часам».
22.05 Ток-шоў «Школа зласлоўя».
23.00 Навіны культуры з Уладзіславам Фляркоўскім.
23.25 «Начны палёт». Вядучы Андрэй Максімаў.

### НТВ
9.00 Сёньня раніцай.
9.20 Надвор'е на заўтра.
9.25 «Вочная стаўка».
10.05 Экстрэмальны кантакт: чарапахі атакуюць.
10.35 «Бухта сьмерці». «Прафэсія — рэпарцёр».
11.00, 16.00 «Сёньня» з Кірылам Паздняковым.
14.35 Ток-шоў «Прынцып даміно».
16.30 «Жаночы погляд».
17.10 «Увага: вышук!».
18.00 «Сёньня» з Тацянай Мітковай.
18.40 Сэрыял «Хлопцы з нашага гораду». 1-я сэрыя.
19.45 Дэтэктыў «На рагу ля Патрыярхавых-3». 1-я сэрыя.
21.00 «Краіна і сьвет». Галоўныя падзеі дня.
21.35 «Сэкс у вялікім горадзе».
22.15 Да 300-годзьдзя Санкт-Пецярбургу. Праект Л.Парфёнава «Расейская імпэрыя: Аляксандар I».

### Эўраспорт
9.30 Мота Гран-пры. Гішпанія.
11.00, 20.15, 2.00 Ралі Аргенціна.
11.30 Трыял на матацыклах у памяшканьні. Чэмпіянат сьвету. Марсэль.
12.30 Футбол. Чэмпіянат Эўропы U-17. Англія — Гішпанія.
14.00 Тэніс. WTA. Рым. Дзень 1-ы.
16.30 Вэляспорт. Джыра д'Італія. 3-і этап.
18.30, 23.00 Эўрагалы. Футбольны часопіс.
20.45 Бокс.
1.00 Матацыклетныя гонкі. Гран-пры. Гішпанія. Найлепшае.

## 13 траўня аўторак

### БТ
6.00, 7.00, 8.00, 15.00, 18.00, 23.00 Навіны.
6.10, 7.10 Добрай раніцы, Беларусь!
8.10, 18.15 «Заля чаканьня». Сэрыял.
**Тэхнічная прафіляктыка да 15.00.**
15.20 «Самая кепская ведзьма».
15.45 Пяць цудаў.
15.55 «Вакол шпіёны». Анімацыйны серыял для дзяцей.
16.20 5х5.
17.00 Кліп-абойма.
17.05 «Тайны Ніра Вулфа». Сэрыял.
19.05 К.Кляўе ў камэдыі «Загарэлыя».
20.40 Калыханка.
21.00 Панарама.
21.45 Навіны рэгіёну.
21.55 «Каралева сэрцаў». Сэрыял.
22.50 Зона Ікс.
23.15 Начны этэр.
0.15 Гістарычная драма «Кароль танцуе».

### СТВ
5.30 Музычны канал.
6.00 «Вар'яцкі сьвет». Дак. фільм.
6.30, 15.50 «Паўэр рэйнджэрз, ці Магутныя рэйнджэры».
6.55, 15.25 «Флінт — дэтэктыў у часе».
7.20, 17.50 «Меншчына. Людзі, падзеі, факты».
7.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30 «24 гадзіны».
7.50. 19.50 «СТВ-спорт».
8.10, 22.50 «Тэхналёгія».
8.20 «Пасланец каралевы».
10.00 «Мастак Леанід Шчамялёў». Дак. фільм.
10.25 «Турпаход».
10.35 «Сталічны футбол зь Ю.Доўнарам».
10.55 «Пакуль гарыць сьвечка».
11.25 «Народ супраць».
12.00 «Віно каханьня».
12.55 «У нас усе дома».
13.50, 18.35 «На рагу ля Патрыярхавых».
14.40 «Бітлборгі».
15.00 «Чалавек-павук».
16.45, 23.15 Праект «Адлюстраваньне»: «Подыюм». Дак. фільм.
18.00 «Дзень добры, доктар!».
18.15 «Менск і менчукі».
18.20 «Тэма дня».
20.05 «Запрашаем паскардзіцца...».
20.15 «Добры вечар, маленькі...».
20.35 «Закон і крымінал».
20.50 Баявік «Глядыятар».
23.00 «Навіны СНД».
0.00 Трылер «Палоньніца каханьня».

### Першы музычны канал
7.00 Пад'ёмнік.
9.00 «120/80».
9.10 Рухач.
14.00 «ІнтэрАктыў».
16.00 «20-ка Першых».
17.0. 19.40 УльтраМікс.
19.30 People-mix.
23.00 МэгаМікс.

### АНТ
8.00, 9.00, 18.00, 20.30, 23.25 Нашы навіны.
8.05 «Добрай раніцы».
9.05, 19.00 «Зямля каханьня, зямля надзеі».
9.50 Камэдыя «Мітусьня».
11.15, 23.40 «Фабрыка зорак-2».
11.45 Дыснэй-клюб: «Лойд у космасе».
15.10 «Падводны сьвет Андрэя Макарэвіча».
15.35 «Сканэр».
16.05 Шматсэрыйны фільм «Дасье дэтэктыва Дуброўскага».
17.00 «Вялікае мыцьцё».
18.10 «Проста сьмех!».
20.00 Час.
21.00 «Ня толькі пра футбол». Спартовы агляд.
21.25 «Хто хоча стаць мільянэрам?».
22.25 «Жаночая лёгіка». 2-я сэрыя.
0.00 «На футболе» зь Віктарам Гусевым.

### РТР
17.50 «Камісар Рэкс».
18.50 Весткі. Дзяжурная часьць.
19.00 Весткі.
19.30 Мясцовы час. Весткі — Масква.
19.50 Дабранач, дзеці!
19.55 «Ідыёт».
20.55 «Людзі і цені-2».
22.00 Ток-шоў «Весткі+».
22.30 Весткі-спорт.
22.40 Крымінальная драма «Законьнік».

### Культура
15.10 «Урокі расейскай». «Усё пра каханьне...». Апавяданьні Н.Тэфі чытае Вольга Аросева.
15.25 Парад тэнараў.
16.05 «Пятае вымярэньне».
16.35 «Сакрэты старажытных». Дак. сэрыял. Фільм 4-ы. «Галовы альмекаў».
17.30 Навіны культуры.
17.50 «Парадак слоў».
17.55 «Палацавыя тайны». «Першы Эрмітаж Расеі».
18.25 Да 300-годзьдзя Санкт-Пецярбургу. «Справа пра Бурштынавы габінэт». Прэм'ера дак. сэрыялу.
19.15 «Партытуры не гараць».
19.40 «Інтэрвэнцыя». Маст. фільм.
21.25 «Што рабіць?».
22.20 80 год народнаму артысту Расеі Мікалаю Пастухову. «Эпізоды».
23.00 Навіны культуры з Уладзіславам Фляркоўскім.
23.25 «Начны палёт».

### НТВ
9.00 Сёньня раніцай.
9.20 Надвор'е на заўтра.
9.25 «Увага: вышук!».
10.10 «Расьліннае жыцьцё».
11.00, 6.00 «Сёньня» з Кірылам Паздняковым.
14.35 Ток-шоў «Прынцып даміно».
16.30 «Хуткая дапамога».
17.25 «Злачынства і пакараньне».
18.00 «Сёньня» з Тацянай Мітковай.
18.40 «Хлопцы з нашага гораду». 2-я сэрыя.
19.45 «На рагу ля Патрыярхавых-3». 2-я сэрыя.
21.00 «Краіна і сьвет».
21.35 Футбол. Ліга чэмпіёнаў. Паўфінал. «Інтэр» (Італія) — «Мілян» (Італія).

### Эўраспорт
9.30 Экстрэмальныя віды спорту.
10.30 Сьпідвэй. Гран-пры.
11.30 Трыял. ЧС у закрытых памяшканьнях. Барсэлёна.
12.30, 20.00 Эўрагалы. Футбольны часопіс.
14.00, 18.30, 21.30 Тэніс. WTA. Рым. Дзень 2-і.
16.30 Вэляспорт. Джыра д'Італія. 4-ы этап.
23.00 Бокс. Ляйпцыг. Р.І.Бэджарана — А.Агузум.
1.15 Матацыклетныя гонкі. Імола.

## 14 траўня серада

### БТ
6.00, 7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 18.00, 23.00 Навіны.
6.10, 7.10 Добрай раніцы, Беларусь!
8.10, 18.15 «Заля чаканьня». Сэрыял.
9.15, 17.05 «Тайны Ніра Вулфа». Сэрыял.
10.00 Тэлевізійны Дом кіно. «Ваенныя фільмы студыі «Беларусьфільм».
10.25 Здароўе. Тэлечасопіс.
10.55 Сола для дэбютанта. С.Марусевіч (сьпявачка).
11.05, 21.55 «Каралева сэрцаў». Сэрыял.
12.15, 14.20 Добры дзень, Беларусь!
13.05 І.Мураўёва ў фантастычнай камэдыі «Каханьне злое».
14.45 «Масква—Менск».
15.20 «Самая кепская ведзьма». Сэрыял для дзяцей.
15.45 Пяць цудаў.
15.55 «Вакол шпіёны».
16.20 5х5.
17.00 Кліп-абойма.
19.10 К.Кляўе ў камэдыі «Загарэлыя на лыжах».
20.40 Калыханка.
21.00 Панарама.
21.45 Навіны рэгіёну.
22.50 Зона Ікс.
23.15 Начны этэр.
0.15 Псыхалягічны трылер «Прывід».

### СТВ
5.30 Музычны канал.
6.00 «Вар'яцкі сьвет».
6.30, 15.50 «Паўэр рэйнджэрз, ці Магутныя рэйнджэры».
6.55, 15.25 «Флінт — дэтэктыў у часе».
7.20, 17.50 «Меншчына. Людзі, падзеі, факты».
7.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30 «24 гадзіны».
7.50, 19.50 «СТВ-спорт».
8.00 «Сьнеданьне зь Інай Афанасьевай».
8.05 «Менск і менчукі».
8.10, 22.50 «Тэхналёгія».
8.20 Баявік «Глядыятар».
10.00 «Запрашаем паскардзіцца».
10.10 «Жывыя сьведкі ледавікоў». Дак. фільм.
10.55, 20.35 «Аўтапанарама».
11.10 «Закон і крымінал».
11.25 «Народ супраць».
12.00 «Віно каханьня».
12.55 «У нас усе дома». Сэрыял.
13.50, 18.35 «На рагу ля Патрыярхавых».
14.40 «Бітлборгі».
15.00 «Чалавек-павук».
16.45, 23.15 Праект «Адлюстраваньне»: «Час байца». Дак. фільм.
17.50 «Меншчына. Людзі, падзеі, факты».
18.00 «Плянэта людзей».
18.15 «Партрэт у інтэр'еры».
20.05 «Турпаход».
20.15 «Добры вечар, маленькі...».
20.50 Катрын Дэнёў і Ўільям Хёрт у псыхалягічнай мэлядраме «Непадалёк ад раю».
23.00 «Навіны СНД».
0.00 Прыгодніцкі фільм «Вязень Зэнды».

### Першы музычны канал
7.00 Пад'ёмнік.
9.10, 16.00 Рухач.
14.00 «ІнтэрАктыў».
17.00, 19.40, 22.10 УльтраМікс.
19.30 People-mix.
22.00 «120/80».
22.30 «Пра Fashion».
23.15, 1.00 МэгаМікс.
0.00 «Чарнасьліў». Культуралягічнае шоў.

### АНТ
8.00, 9.00, 18.00, 20.30, 23.00 Нашы навіны.
8.05 Тэлеканал «Добрай раніцы».
9.05, 19.00 «Зямля каханьня, зямля надзеі».
9.50 Камэдыя Леаніда Гайдая «Небясьпечна для жыцьця».
11.20 «Ня толькі пра футбол». Спартовы агляд.
11.40, 23.15 «Фабрыка зорак-2».
12.10 Дыснэй-клюб: «Лойд у космасе».
15.10 «Індыйскія касты».
15.35 «Танк Т-34». Зброя перамогі.
16.05 Шматсэрыйны фільм «Дасье дэтэктыва Дуброўскага».
17.00 «Вялікае мыцьцё».
18.10 Сьмехапанарама.
20.00 Час.
21.00 «Слабае зьвяно».
22.00 Дэтэктыў «Жаночая лёгіка-2».
23.35 Трылер «Незабыўнае».

### РТР
7.45, 19.55 Сэрыял «Ідыёт».
8.45, 20.55 Сэрыял «Людзі і цені-2».
9.45, 18.50 Весткі. Дзяжурная часьць.
10.00, 19.00 Весткі.
17.50 «Камісар Рэкс».
19.30 Мясцовы час. Весткі — Масква.
19.50 Дабранач, дзеці!
22.00 Ток-шоў «Весткі+».
22.30 «Мне сьніцца расейскі сьнег».

### Культура
15.10 «Урокі расейскай». «Усё пра каханьне...». Апавяданьні Н.Тэфі чытае Вольга Аросева.
15.25 «Душою споўнены палёт». Выступаюць «зоркі балету» Расеі.
16.05 «Клясыкі сучаснага мастацтва». Сямён Файбісовіч.
16.35 «Сакрэты старажытных». Дак. сэрыял.
17.30 Навіны культуры.
17.50 «Парадак слоў». Кніжныя навіны.
17.55 «Айчына і лёсы».
18.25 Да 300-годзьдзя Санкт-Пецярбургу. «Справа пра Бурштынавы габінэт».
19.15 «Дапамажыце Тэлеку».
19.25 «Сабака ў ботах». Мультфільм.
19.45 «Збор выкананьняў». Грае Аляксандар Мельнікаў (фартэпіяна).
20.25 «Апокрыф».
21.05 «Тэатральны раман». Маст. фільм.
23.00 Навіны культуры з Уладзіславам Фляркоўскім.
23.25 «Начны палёт».

### НТВ
9.00 Сёньня раніцай.
9.20 Надвор'е на заўтра.
9.25 Дак. драма «Злачынства і пакараньне».
9.55 «Кулінарны паядынак»: «І на моры, і на сушы».
11.00, 16.00 «Сёньня» з Кірылам Паздняковым.
14.35 Ток-шоў «Прынцып даміно».
16.30 «Хуткая дапамога». Сэрыял.
17.25 Шчырае прызнаньне.
18.00 «Сёньня» з Тацянай Мітковай.
18.40 Сэрыял «Хлопцы з нашага гораду».
19.45 Дэтэктыў «На рагу ля Патрыярхавых-3».
21.00 «Краіна і сьвет». Галоўныя падзеі дня.
21.35 Футбол. Ліга чэмпіёнаў. Паўфінал. «Ювэнтус» (Італія) — «Рэал» (Гішпанія).

### Эўраспорт
9.30 Сэрыі. Аўтамотаспартовы часопіс.
10.00 Вэлягонка. Італія. Giro. 4-ы этап.
11.00 Эўрагалы. Футбольны часопіс.
12.30 Футбол. Спецагляд.
13.00 Сьпідвэй. Гран-пры.
14.00 Тэніс. WTA. Рым. Дзень 3-і.
16.30 Вэляспорт. Джыра д'Італія. 5-ы этап.
19.00 Футбол. Чэмпіянат Эўропы U-17. Партугалія. Паўфіналы.
22.00 Анонс вячэрняй серады.
22.15 Конны спорт. Кубак нацый.
23.15 Гольф. Спэцагляд.
0.30 Ветразевы спорт. Яхты.
1.00 Спартовыя прыгоды на прыродзе.
1.30 Тэніс. WTA. Рым.

## 15 траўня чацьвер

### БТ
6.00, 7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 18.00, 23.00 Навіны.
6.10, 7.10 Добрай раніцы, Беларусь!
8.10, 18.15 «Заля чаканьня». Сэрыял.
9.10, 17.05 «Тайны Ніра Вулфа». Сэрыял.
10.00 «Сьвятло далёкай зоркі. Віктар Вуячыч». Аўтарская праграма Аляксандра Дамарацкага.
10.25 «Касыяпэя». Пазнавальны сэрыял.
10.55 Наша спадчына. Касьцёл сьв.Станіслава ў Магілёве.
11.10, 21.55 «Каралева сэрцаў». Сэрыял.
12.15, 14.15 Добры дзень, Беларусь!
13.05 І.Мураўёва ў камэдыйнай мэлядраме «Артыстка з Грыбава». 1-я сэрыя.
15.20 «Самая кепская ведзьма». Сэрыял для дзяцей.
15.45 Пяць цудаў.
15.55 «Вакол шпіёны». Сэрыял для дзяцей.
16.20 5х5.
17.00 Кліп-абойма.
19.10 Камэдыйная мэлядрама «Дзіця напракат».
20.40 Калыханка.
21.00 Панарама.
21.45 Навіны рэгіёну.
22.50 Зона Ікс.
23.15 Начны этэр.
0.15 Трылер «Лютасьць».

### СТВ
5.30 Музычны канал.
6.00 «Вар'яцкі сьвет».
6.30, 15.50 «Паўэр рэйнджэрз, ці Магутныя рэйнджэры».
6.55, 15.25 «Флінт — дэтэктыў у часе».
7.20, 17.50 «Меншчына. Людзі, падзеі, факты».
7.30, 16.30, 19.30, 22.40 «24 гадзіны».
7.50, 19.50 «СТВ-спорт».
8.00 «Тэма дня».
8.10, 23.00 «Тэхналёгія».
8.20 «Турпаход».
8.30 «Партрэт у інтэр'еры».
8.45 «Фільм, фільм, фільм».
15.00 «Чалавек-павук». Мультсэрыял.
16.50 «Дыялёг з усім сьветам»: «Шукальнікі золата».
18.00 «Тэатральныя гісторыі».
18.15 «Рамонт».
18.35 «На рагу ля Патрыярхавых».
20.05 «Гульнявы рэфлекс».
20.15 «Добры вечар, маленькі...».
20.30 «Фільм, фільм, фільм».
20.50 Баявік «Скалалаз».
23.10 «Навіны СНД».
23.25 «Навіны сусьветнай шоў-індустрыі».
0.00 Драма «Код невядомы».

### Першы музычны канал
7.00 Пад'ёмнік.
9.00 «120/80».
9.10, 16.00 Рухач.
14.00 «ІнтэрАктыў».
17.00, 19.40, 22.30 УльтраМікс.
19.30 People-mix.
22.00 «Сіла цягі». Аўтапраграма.
23.00 МэгаМікс.

### АНТ
**Тэхнічная прафіляктыка да 15.10.**
15.10 «Калі заўтра на Марс».
16.05 Шматсэрыйны фільм «Дасье дэтэктыва Дуброўскага».
17.00 «Вялікае мыцьцё».
18.00, 20.30, 23.00 Нашы навіны.
18.10 «Жарт за жартам».
18.40 «Бяз тэрміну даўнасьці». Дак. дэтэктыў.
19.10 «Зямля каханьня, зямля надзеі».
20.00 Час.
21.00 «Асноўны інстынкт». Ток-шоў.
22.00 Дэтэктыў «Жаночая лёгіка-2».
23.15 Камэдыя «Гісторыя каханьня піраманьяка».
0.50 Футбол. Міжнародны турнір на «Кубак Лабаноўскага».

### РТР
7.45, 19.55 «Ідыёт».
8.45, 20.55 «Людзі і цені-2».
9.45, 18.50 Весткі. Дзяжурная часьць.
10.00, 19.00 Весткі.
17.50 «Камісар Рэкс».
19.30 Мясцовы час. Весткі — Масква.
19.50 Дабранач, дзеці!
22.00 Ток-шоў «Весткі+».
22.30 Весткі — спорт.
22.40 Кінаакадэмія. Прэмія «Оскар». Брэд Піт, Энтані Хопкінс і Джулія Армонд у маст. фільме «Легенды восені».

### Культура
15.10 «Урокі расейскай». «Усё пра каханьне...».
15.25 Вечар венскай музыкі.
16.05 «Пецярбург: час і месца». «Трэба быць героем».
16.35 «Непрадбачаны антракт». Дак. фільм.
17.10 «Гербы Расеі».
17.30, 23.00 Навіны культуры.
17.50 «Парадак слоў». Кніжныя навіны.
17.55 «Хто мы?». «Хроніка смутнага часу».
18.25 «Справа пра Бурштынавы габінэт». Дак. сэрыял.
19.15 «Дапамажыце Тэлеку».
19.20 «Трое з Прастаквашына». Мультфільм.
19.40 «Царская лёжа». IV Міжнародны конкурс імя С.Пракоф'ева.
20.20 «Вясельле». Маст. фільм.
21.25 «Культурная рэвалюцыя».
22.20 «Эпізоды».
23.25 «Начны палёт».

### НТВ
9.00 Сёньня раніцай.
9.20 Надвор'е на заўтра.
9.25 Шчырае прызнаньне.
10.00 «Кватэрнае пытаньне».
11.00, 16.00 «Сёньня» з Кірылам Паздняковым.
14.35 Ток-шоў «Прынцып даміно».
16.30 «Хуткая дапамога».
17.25 «Вочная стаўка».
18.00 «Сёньня» з Тацянай Мітковай.
18.40 «Хлопцы з нашага гораду».
19.45 «На рагу ля Патрыярхавых-3».
21.00 «Краіна і сьвет». Галоўныя падзеі дня.
21.40 «Сэкс у вялікім горадзе».
22.25 Праект Л.Парфёнава «Расейская імпэрыя: Аляксандар I».

### Эўраспорт
9.30 Конны спорт. Кубак нацый.
11.00 Футбол. Чэмпіянат Эўропы U-17. Партугалія. Паўфіналы.
14.00, 21.30 Тэніс. WTA. Рым. Дзень 4-ы.
18.30 Тэніс WTA. Марціна Хінгіс. Спэцрэпартаж.
19.00 Спартовыя прыгоды на прыродзе.
19.30 Футбол. Кубак Лібэртадорэс. 1/8 фіналу.
23.00 Вольныя баі.
0.15 Баявыя майстэрствы. Парыж — Бэрсі.

# Ідэалягізацыя без ідэалёгіі


IREX-PROMEDIA

**Міністар адукацыі Пятро Брыгадзін і галоўны ідэоляг Адміністрацыі прэзыдэнта Іван Карэнда гатовыя ўдасканаліць ідэалягічную работу са студэнтамі.**

28—29 красавіка ў трох навучальных установах краіны (Магілёўскі дзяржунівэрсытэт, Беларускі дзяржаўны эканамічны ўнівэрсытэт і РІВШ БДУ) прайшлі сэмінары-нарады прадстаўнікоў Міністэрства адукацыі з загадчыкамі гуманітарных катэдраў усіх ВНУ краіны, якія тычыліся пытаньняў удасканаленьня ідэалягічнай работы з студэнтамі.

Мэтастазы савецкай штохвіліннай школы: выкладчыкам рэкамэндавалася чытаць студэнтам лекцыі пра добрае жыцьцё пад сёньняшняй уладай, але ня болей. Аднак пасьля выступу Лукашэнкі перад парлямэнтам дзяржава пачала больш жорстка ўмешвацца ва ўнівэрсытэцкае жыцьцё. Самыя высокія чыноўнікі агучылі ідэю ўвесьці ва ўсіх ВНУ пасады рэктара па ідэалягічнай рабоце вярнуць практыку публічных лекцыяў выкладчыкаў перад працоўнымі на заводах.

Скліканыя пры канцы красавіка нарады пацьвердзілі кірунак цяперашніх уладаў на перайманьне досьведу савецкай вышэйшай школы. Праўда, дагэтуль незразумелы асноўны кірунак ураду: шчыльны саюз з Расеяй ці ўсё ж незалежнасьць?

Выступоўцы — намесьнікі міністра адукацыі, прарэктары і прафэсары — настойвалі на неабходнасьці ідэалягізацыі ўсіх гуманітарных вучэбных дысцыплінаў, але згадзіліся з думкай, што самой ідэалёгіі яшчэ няма. «Яе няма нават у нашага прэзыдэнта», — роспачна заўважалі выступоўцы. «Дрэнна вучыўся», — адказвалі ім з залі.

Сякія-такія ідэі па пабудове магчымай ідэалёгіі выказваліся. Прафэсар Рашэтнікаў прапанаваў узяць за аснову Канстытуцыю, нацыянальны сьветапогляд, беларускую эканамічную і палітычную мадэлі, пры гэтым пазначыўшы, што ў нацыянальным сьветапоглядзе неабходна вылучаць агульначалавечыя, хрысьціянскія і патрыятычныя каштоўнасьці. А тое, што стваральнікамі ідэалёгіі маюць стаць прэзыдэнт, парлямэнт і ўсё дзяржчынавенства, засьведчыла, якія менавіта каштоўнасьці будуць выбраныя з «агульнае масы».

**АБ, Магілёў**

ДЗІВОСЫ

## Бізуна за пацалунак

**Іранская акторка Гохар Кхейрандзіш умоўна пакараная 74 ударамі бізуном за тое, што прылюдна «пацалавала мужчыну».** Яна цмокнула ў лоб вучня свайго нябожчыка-мужа (рэжысэра), якому ўручала прыз, а ў Іране фізычны кантакт між несваякамі рознага полу забаронены. Пасьля прабачэньняў акторкі суд вынес умоўны вырак.

## Не хадзі з курыцай

**Італьянскага турыста затрымалі ў Нідэрляндах за тое, што выйшаў на шпацыр з сваёй курыцай: у краіне лютуе птушыны грып.** Іх завезьлі ў пастарунак, дзе вэтэрынар абсьледаваў курыцу. З гаспадара ўзялі грошы за паслугі доктара й амбуляторнае ўтрыманьне птушкі.

## Зарыбленьне Сьвіслачы

**У Сьвіслач ад Камсамольскага возера да парку Горкага пускаюць рыбу — некалькі цэнтнэраў карасёў і шчупакоўў.** Гэта не малькі, а ладная ўжо рыба, і менчукі могуць яе лавіць. Рабіць гэта дазволена толькі адной вудай.



## «Старога» больш няма

**У амэрыканскім штаце Нью-Гэмпшыр абрынулася славутая скала, што нагадвала твар старога.** «Стары гораў» рассыпаўся ад дажджу і ветру — яму было каля 200 млн. гадоў.

## Да нас едуць працаваць

**Бялыніцкі рынак працы асвойваюць замежнікі:** 15 украінцаў цяпер працуюць у фэрмэрскай гаспадарцы «Паўлінка», 10 малдаванаў — у калгасе «Наша перамога», 6 грузінаў — у сялянска-фэрмэрскай гаспадарцы «Аазыс».

**СМ; БелаПАН, Reuters**

# Зьелі «герб» за дваццаць хвілін

**11 траўня ў Горадні, на афіцыйным мітынгу, прысьвечаным Дню дзяржаўнага сьцяга і герба, сябры незарэгістраванай моладзевай арганізацыі «Разам» кармілі людзей капустай.** Тыя, хто раздаваў капусту, былі апранутыя ў кашулькі з надпісам «Я прыйшоў сюды добраахвотна». Тры качаны, якія сымбалізавалі сёньняшні дзяржаўны герб, былі зьедзеныя за дваццаць хвілінаў. На мітынгу прысутнічала дзьве тысячы чалавек, сабраных з розных навучальных установаў па разнарадцы гарвыканкаму.

**pahonia.promedia.by**




АСОБЫ ТЫДНЯ

**Віктар Лукашэнка**, які быў дарадцам аддзелу Заходняй Эўропы ў МЗС, спыніў працу 18 красавіка. Афіцыйна звальненьне тлумачыцца ўласным жаданьнем. Ягоную заяву падпісаў Сяргей Мартынаў.

**Максім Мірны** ў чарговым рэйтынгу Асацыяцыі тэнісістаў-прафэсіяналаў займае 18-ы радок. За гэты сэзон ён зарабіў 277 тыс. даляраў. Уладзімер Ваўчкоў у рэйтынгу на 65-м месцы.

**Скульптар Уладзімер Жбанаў** упрыгожыў фантан ля менскай Камароўкі дзьвюма бронзавымі гусямі. Паўтара месяца скульптару «пазавала» жывая гусь, адмыслова набытая на Ждановічах. Цяпер птушка ў заапарку.

**Джордж Крол**, кар'ерны амэрыканскі дыплямат, прызначаны новым паслом ЗША ў Беларусь. Раней ён працаваў у пасольстве ЗША ў Расеі, быў намесьнікам пасла ў Менску і супрацоўнікам дыпмісіі ва Ўкраіне. Скончыў Гарвард і Оксфард.

**Зьміцер Жук**, які ўзначальваў прэс-службу дзяржавы, цяпер будзе кіраваць інфармацыйным агенцтвам БелТА. Ягоны папярэднік, экс-службіст Алег Пралескоўскі, цяпер займае пасаду намесьніка кіраўніка Адміністрацыі прэзыдэнта.

**Вэтэран Віктар Цярэшчанка** зь вёскі Копцы (Віцебшчына) саматужна паставіў цэмэнтавы помнік сыну Сталіна Якаву. У вайну Джугашвілі-малодшы недзе там трапіў у нямецкі палон. На адкрыцьцё помніка сабралі чалавек дзьвесьце — нават выхаванцаў дзіцячага садку з балёнікамі прывялі. Раённая ўлада, як той Пілат, не паказалася, хоць усё дазволіла. Вэтэран поўны энэргіі й зьбіраецца адчыніць музэй баявой славы.

**Аляксандар Старыкевіч**, звольнены на загад Леаніда Козіка з газэты ФПБ «Беларускі час», узначаліў газэту Незалежнага прафсаюзу «Салідарнасьць». Яе выпуск адноўлены 24 красавіка.

**Берасьцейскія апэратыўнікі** затрымалі грамадзяніна Нямеччыны, што быў у міжнародным вышуку. Паводле інфармацыі сьледзтва, ён прапаноўваў немцам туры ва Ўсходнюю Эўропу, браў грошы, а пасьля зьнікаў. «Зарабіў» аж 265 тыс. эўра. Затрымалі яго ў вёсцы Вычулкі (Берасьцейшчына), дзе жывуць ягоныя маці й сястра.

**СМ**

УДАКЛАДНЕНЬНЕ

У «НН» №15 у матэрыяле «Перад Радаўніцай» замест «Случчакі зьбіраюцца 20-га прыбраць пахаваньні Альгерда Абуховіча, Яўгена Гучка і іншых беларускіх дзеячоў на мясцовых могілках» трэба чытаць «Случчакі зьбіраюцца 20-га прыбраць пахаваньне Альгерда Абуховіча». Перапрашаем за прыкрую недакладнасьць.

# Вясёлыя валуны


АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

Новы від мастацтва вынайшлі ў беларускіх лясьніцтвах. Вырашыўшы, мусіць, што прырода недасканалая ў сваёй прыгажосьці, лясгасы Меншчыны выдаткавалі энную суму грошай на яскравыя алейныя фарбы, каб размаляваць... прыдарожныя камяні. Замшэлыя валуны абапал аўтастрады маглі б выклікаць у падарожнага непажаданыя эмоцыі. Зусім іншая справа, калі вока будучы вабіць вясёлкавага колеру глыбы ў стылі поп-арт ды яшчэ з карысным інфармацыяй: «Лес — лёгкие планеты», «Огонь — враг леса», «Браконьер — враг природы». На некаторых камяніскаx намаляваныя стылізаваныя выявы ласёў ды аленяў, а недзе пад Лагойскам — нябачаная раней пачвара з двума вялікімі зубамі, надпіс пад якой — «Они охраняются» — сьведчыць пра ўнікальнасьць жывёліны.

Агульнаадукацыйныя лёзунгі разпораз зьмяняюцца выхаваўчымі і натхняльнымі: «Берегите фауну!», «Любите природу!», «Браконьерам — бой!», «Берегите птиц!» і да т.п. Заклікі з кожным чарговым каменем паўтараюцца, і ўрэшце табе ўжо карціць крыкнуць шафёру: «Тармазі!» — ды рынуцца ў лясныя нетры зь цьвёрдым намерам берагчы «пціц» і фаўну ды біць браканьераў.

Клопатам гаспадароў лесу вырашаюцца адразу некалькі важных задач: экалягічнае ды вайскова-патрыятычнае выхаваньне ездакоў, аздабленьне беларускіх краявідаў і ўвекавечаньне другой дзяржаўнай мовы манумэнтальныімі сродкамі.

Навінка мастацтва прыжылася, «вясёлыя» валуны з-пад Менску дакаціліся аж да Лепелю. Калі гэтак пойдзе далей, нашым нашчадкам давядзецца ехаць у сталічны музэй валуноў, каб даведацца, за што ж гэта паэты мінуўшчыны называлі іх сівымі.

**Антон Бубала, Верхнядзьвінск**

# Афанасьева рэклямуе «Audi»

матаршоў



IREX-PROMEDIA

«FIAT Punto Sporting» выклікаў цікавасьць у наведвальнікаў аўтавыставы.

**У менскім Палацы лёгкай атлетыкі спарткомплексу ўзброеных сілаў ад 29 красавіка да 5 траўня адбылася міжнародная аўтавыстава «Матаршоў». Як і ў мінулыя гады, ёй папярэднічала моцная рэклямная кампанія, якая забясьпечыла арганізатарам высокую наведвальнасьць (вялікую штурханіну) і неблагія прыбыткі. Але ўсё ж вынікі ня цалкам адпавядалі чаканьням.**

## Меней мадэляў

Колькасьць аўтавытворцаў, якія прэзэнтавалі свае мадэлі, была найслабейшым месцам «Матаршоў». У выставе не ўзялі ўдзелу такія вядомыя кампаніі, як «Mercedes», «Toyota», «Mazda». Астатнія ж у асноўным выстаўлялі ранейшыя мадэльныя шэрагі, хоць здараліся й прыемныя выключэньні.

Дзьве навінкі зьявіліся на стэндзе «Volkswagen»: адна з апошніх распрацовак кампаніі джып «Touareg» і аўто прадстаўнічай клясы «Phaeton». Пацешыла вока «Volvo-XC90» 2004-га мадэльнага году. «Ford» наладзіў прэзэнтацыю новага «Mondeo-ST220» — «такога хуткага, што не пасьпееш разгледзець». Не адставала й «Audi», запрасіўшы Іну Афанасьеву прасьпяваць колькі песень каля новай мадыфікацыі A8. З амэрыканскім размахам заявіла пра сябе «General Motors», выставіўшы агромністы «Escalade EXT» — машыну, для якой наўрад ці хапіла б шырыні адной паласы на праспэкце Скарыны.

Разрэклямаваны спартовы «Porsche Boxter» месьціўся ў асобным павільёне разам з сваім больш традыцыйным суродзічам «Porsche Cayenne». Абяцалі, што «бокстэр» прывязуць у Менск з Штутгарту. Але на латвійскіх нумарох было напісана: «Baltijas Sporta Auto». Выглядае, што машына сьпярша заехала да нашых паўночных суседзяў.

У тым самым павільёне можна было пабачыць легендарныя «Harley Davidson» коштам каля 19 тыс. эўра. Былі й іншыя мадэлі, але ім унутры месца не хапіла, таму байкеры зладзілі міні-паказ сваіх матацыклаў проста на двары. Раз-пораз яны каталі дзяўчат з «Матаршоў» вакол комплексу, заглушаючы маторамі ўсё навокал.

Было відаць, што арганізатары прыклалі намаганьні, каб прыцягнуць як мага больш удзельнікаў. Аднак, як трапна заўважыў адзін з наведнікаў, «на стаянцы была палова тых самых машын, што й на выставе».

## VIP-дзень

З абяцаных выгодаў наведваньня першага дня выставы былі заўважныя хіба розыгрышы каштоўных прызоў і бясплатныя напоі. «Адчыненыя дзьверы ўсіх аўтамабіляў» калінікалі зачыняліся перад самым носам наведнікаў, бо «машыну ўжо прадалі, і ў салён цяпер нікога не пускаем». Здаралася й так, што патэнцыйных пакупнікоў ветліва, але настойліва прасілі выйсьці з машыны.

У якасьці адмысловай праграмы выступалі даўганогія дзяўчаты й клоўн, але іх можна было пабачыць і ў наступныя дні «Матаршоў». Каталёг з «эксклюзіўнай інфармацыяй», які павінен быў атрымаць кожны наведвальнік VIP-дня, відаць, выйшаў надта абмежаваным накладам, і пра яго пасьпяхова забыліся ўжо да абеду. Пра «меншую колькасьць людзей» і казаць не даводзілася. Больш-менш вольна стала толькі пад вечар, калі высьветлілася, што ўдвая даражэйшы квіток ня быў варты гэткіх грошай.

## ДАІ — у народ

Ля стэнду дзяржаўтаінспэкцыі акрамя вядомага менчукам міліцэйскага «Opel Astra» і матацыклу суправаджэньня BMW можна было пабачыць спэцсродкі, якія выкарыстоўваюцца беларускай міліцыяй. Газавы балёнчык суседнічаў з гумовым дручком і рацыяй. На тварах у міліцыянтаў была нязвыклая ўсьмешка, зь якой яны даходліва тлумачылі цікаўным асаблівасьці законаў і прынцыпы сваёй працы. Для тых, хто ня меў часу стаяць у чарзе па кансультацыю, зрабілі адмысловую скрыню для пытаньняў. Але самай запамінальнай сталася дзяўчынаміліцыянтка ў парадный форме, якая лёгка магла даць фору многім прыгажуням ля стэндаў з аўтамабілямі.

**Ян Мацур**

надвор'е

# Травень



АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

Стараславянская назва апошняга месяца каляндарнай вясны — «травень» — захавалася ў нас гэтаксама, як і ва ўкраінцаў. Сонечныя промні падаюць на паверхню глебы пад вуглом, большым за 50°. Сьветлы час сутак на поўначы перавышае 500 гадзін за месяц. Найбольш характэрныя рысы траўня — хуткі рост тэмпэратуры паветра, глебы, вады, невялікая колькасьць ападкаў (50—60 мм), цьвіценьне садоў, чаромхі і ландышу.

У другой дэкадзе ў Беларусь звычайна прыходзіць фэналягічнае лета. Але часта пасьля цяпла на пару дзён вяртаюцца халады і замаразкі, якія ў трох зь пяці гадоў ахопліваюць усю краіну. Прычым паветра ўначы і раніцай можа выхаладжвацца на Палесьсі больш, чым на поўначы краіны, — да -3…-8 °С. Прырода і гаспадарка атрымліваюць значную шкоду.

Сярэдняя тэмпэратура траўня павялічваецца ў мэрыдыяльным напрамку ад +11,5 да +14 °С. Абсалютныя максымумы на ўсёй тэрыторыі перавышаюць +30 °С, месцамі сягаючы +34 °С. Адносная вільготнасьць мае найменшы паказьнік за ўвесь год — ад 64 да 72%, што пры адносна невысокім тэмпэратурным фоне асабліва спрыяе выдзяленьню нэктару.

Да другой сусьветнай вайны г.зв. «чаромхавыя» халады былі значна радзейшымі. Часьцей і сьнег выпадае ў апошнія 60 гадоў. У 1945, 1952 г. моцныя сьнегапады ішлі нават у апошняй дэкадзе траўня, ад чаго загінула безьліч птушанятаў, што яшчэ не пасьпелі ўбрацца ў пер'е . У 1994 г. гэткая ж зьява загубіла амаль усю квецень на поўдні краіны. Цёплым і сухім быў травень у 1975, 1993, 1996 г.

Часьцей, чым у які іншы час, у траўні выпадае град. На Палесьсі й усходзе Магілёўшчыны — ад 1 да 3 разоў за месяц. Вядома, якую шкоду гэта прыносіць расьлінам.

З поўдня прылятаюць чорныя стрыжы, казадоі. Апошняй вяртаецца івалга, акурат калі на дрэвах распусьціцца лісьце. Працягваюць нераставаць акуні, а г.зв. «белая рыба» — толькі пачынае.

**Юры Фралоў**

# Беларуска адраджае чукоцкую мову

**Выбітнай дзяячкай чукоцкага нацыянальнага руху стала беларуска Зоя Тагрына.** Яна гэтак добра авалодала чукоцкай мовай, што нават складае на ёй песьні. Яшчэ яе маці-музыказнаўца зацікавілася своеасаблівай культурай паўночных народаў, асабліва музыкай. Цяпер сп.Зоя працуе над тым, каб знайсьці спосаб запісу чукоцкіх песьняў, бо іх амаль немагчыма запісаць у эўрапейскай нотнай сыстэме.

Пра З.Тагрыну піша расейскае выданьне «Антифашистский мотив», якое прысьвяціла ёй цэлы нумар (№1 за 2002 год) асьветленьню сёньняшняга становішча каракаў, чукчаў і кетаў.

**Язэпат Змысла**

новае кіно

# «Салярыс»–2



Знакаміты, амбіцыйны Стывэн Садэрбэрг, які ў 27 гадоў атрымаў «Залатую пальмавую галінку» за «Сэкс, хлусьню і відэа», а ў 37 спабарнічаў за рэжысэрскі «Оскар» сам з сабой (фільмы «Эрын Брокавіч» і «Трафік»), на пачатку 2003 г. экранізаваў Лемаў «Салярыс». Гэтым раманам жадаў заняцца сам Джэймз Кемэран, але, дазнаўшыся пра намер Садэрбэрга, саступіў яму, задаволіўшыся роляй прадусара. Што ж выйшла?

Першыя ж кадры фільму — пролівень, які нудотна барабаніць у вокны, — сьведчаць аб тым, што Садэрбэрг зрабіў не экранізацыю раману Станіслава Лема (яго дзея пачынаецца на касьмічнай станцыі, а не на Зямлі), а рэмэйк стужкі Андрэя Таркоўскага. Тыя ж пляны. Тая ж напружаная маўклівасьць. Пабудаваная ў здымачным павільёне «XXth Century Fox» касьмічная станцыя выглядае як масфільмаўская пасьля эўрарамонту. Падабенства Джорджа Клуні, які грае Крыса Кельвіна, да Данатаса Баніёніса відавочнае. Усё тое — ды ня тое.

Зусім як героі «Салярысу» Таркоўскага, Садэрбэрг — выявілася — няздольны асвойваць космас і адкрываць іншыя сусьветы; ён толькі паўтарае ўжо пройдзенае. Рэчы, якіх Стыў не разумее, ён ціха замяняе на знаёмыя клішэ. Гэтакім неспасьцігальным для інтэлігентнага галівудзкага акулярыка стаўся канфлікт Крыса з жонкай. У новым фільме Хары — гістэрычка, якая спачатку, не спытаўшыся ў мужа, робіць аборт, а потым скончае самагубствам. Крыс жыве ўспамінам пра яе — і яны «сустракаюцца» на Салярысе… Канфлікт ператвараецца ў мэлядраматычную ідылію.

«Чалавек, які пойдзе на «Салярыс», каб пабачыць «Чужых», будзе вельмі зьдзіўлены, але гэта не артгаўзны фільм, — кажа пра стужку Джордж Клуні (сам Садэрбэрг прынцыпова не даваў інтэрвію). — Ён для ўсіх, таму што гісторыя вельмі добра распавядзена». Сапраўды, зрабіць з «Салярысу» «Чужых» нават у Садэрбэрга не паднялася рука. Аднак наяўнасьць у амэрыканскай вэрсіі асноўных рэйтынгавых матрыцаў бясспрэчная. Каб застацца палітказрэктным, рэжысэр увёў у штат касьмічнай станцыі жанчыну-навукоўца. Вядома ж, афраамэрыканку. Вітаецца наяўнасьць у фільме надзеі — і замест жудасных фантомаў зьяўляецца хлопчык, які працягвае Крысу руку дапамогі.

**Павал Сьвярдлоў**

# «Менская вясна» ў вандроўнай Філярмоніі



Сталічная філярмонія ператварылася ў прывід. Стаіць сабе маўклівы будынак на плошчы Якуба Коласа, ніхто ня ведае, што ў ім адбываецца.

IREX-PROMEDIA

Кепская назва для музычнага фэсту — «Менская вясна». То бок, назва была б добрай, калі б не парушалі філярманічнага капірайту. Сем гадоў таму апазыцыя зладзіла шэраг акцыяў, што захаваліся ў гісторыі як «Менская вясна-96». Потым быў міжнародны фэст «Менская Вясна-2000», на якім прэзэнтавалася альтэрнатыўнае мастацтва. Крытыкі губляліся ў здагадках, якім чынам канцэрты экстрэмальных гуртоў «Diffusion Ensemble» ды «Pidżama Porno» трапілі ў праграму акадэмічнай «Вясны». Дый увогуле, шуму было дужа — асабліва калі міліцыя затрымала ўсіх фота- і тэлежурналістаў, што здымалі паказ пэрформансаў каля кінатэатру «Радзіма». А летась кіналягічнае аб’яднаньне «Альба Рос» ладзіла рэгіянальную выстаўку сабакаў (апрача дабэрманаў і таксаў) з назваю «Менская вясна-2002».

Рэклямы сёлетняй «Менскай вясны», якую ладзіць Філярмонія, амаль не было відаць. Хіба дзе-нідзе афішы на тралейбусных прыпынках. Газэты й тэлебачаньне маўчалі. Інтэрнэт-сайт Філярмоніі, на якім мусіла месьціцца адпаведная інфармацыя, не пасьпеўшы нарадзіцца, зьнік недзе ў віртуальнай прасторы. Дзіўна: у Берасьцейскай філярмоніі ёсьць свая старонка ў Сусьветным павуціньні, у Віцебскай — таксама. А галоўная філярмонія краіны з усімі славутымі калектывамі прадстаўніцтва ў Сеціве ня мае. Замежны імпрэсарыё, пра якога мараць усе тутэйшыя музыкі, запусьціўшы пошук на сваім кампутары, аніякім чынам не даведаецца, што цікавага адбываецца ў Беларускай філярмоніі, каб гэтае цікавае прапанаваць плацежаздольнаму эўрапейскаму слухачу.

## Прывід філярмоніі

Сталічная філярмонія ператварылася ў прывід. Стаіць сабе маўклівы будынак на плошчы Якуба Коласа, ніхто ня ведае, што ў ім адбываецца, — ці яго рамантуюць, ці не. Прынамсі, да канца сакавіка там прайшлі толькі дэмантажныя работы — пры тым, што, згодна з урадавымі дырэктывамі, канцэртная заля павінна 1 лістапада адчыніць свае дзьверы для слухачоў. Беларуская філярмонія будавалася сорак гадоў таму паводле тыпавога праекту (датуль сымфанічныя канцэрты адбываліся ў Клюбе імя Дзяржынскага ды ў Доме афіцэраў, а камэрная музыка ўвогуле нікога не цікавіла) і ўрачыста адчынілася 13 красавіка 1963 г. Ад таго часу будынак аніводнага разу капітальна не рамантавалі — задавальняліся лёгкай «касмэтыкай». Скончылася тым, што летась 1 чэрвеня Філярмонію зачынілі загадам МНС на няпэўны тэрмін: ад столі пачалі адвальвацца кавалкі тынкоўкі па дзесяць кіляграмаў.

Філярмонія ператварылася ў прывід. Адміністрацыя сядзела ў сваіх пакоях, сымфанічны аркестар рэпэтаваў у фае, канцэртнае жыцьцё ледзь цеплілася. Сэзон адкрыўся пампэзным канцэртам у памяшканьні Опэры. Дырыгаваў Аляксандар Анісімаў, які на той час займаў адразу дзьве пасады галоўнага дырыжора: у сымфанічным аркестры Філярмоніі дый у аркестры Тэатру опэры і балету. Мо гэтым і тлумачыцца тая лёгкасьць, зь якой опэрна-балетная дырэкцыя адмовілася браць за гэты канцэрт арэндную плату. Дый пазьней усе філярманічныя канцэрты ў опэрнай залі адбываліся з абавязковым удзелам А.Анісімава — нават тады, калі ён страціў сваю пасаду ў Опэры.

## Колькі каштуе канцэрт

Акурат дзеля вялікае арэнднае рэнты сымфанічных канцэртаў у гэтым сэзоне было няшмат. 27 сьнежня 2001 г. стаўкі арэнднае платы за канцэрты ў дзяржаўных памяшканьнях падвысіліся ў некалькі разоў. Раней за арэнду залі на адзін вечар у Купалаўскім тэатры трэ было заплаціць 0,18 даляра з кожнага пасадачнага месца, у Доме афіцэраў — 0,32. Найвышэйшая стаўка была ў КЗ «Менск» — 1,05 даляра. Пасьля падвышэньня арэндная стаўка ў Купалаўскім тэатры дасягнула 1,5 даляра; у Доме афіцэраў і Клюбе імя Дзяржынскага — 2; у канцэртнай залі «Менск» — 2,9; у Палацы Рэспублікі — ажно 3,5 даляра. Менавіта з прычыны неймаверна завышанае арэнды стаўся немажлівым рамонт Опэры, які даўно ўжо насьпеў. Плянавалася ж, што на час рамонту опэрная і балетная трупы «пераедуць» у Палац Рэспублікі.

У лютым 2003 г. стаўкі былі перагледжаныя. Зьніжкі атрымалі артысты драматычных тэатраў краінаў СНД, артысты беларускай эстрады і беларускіх тэатраў, выступы артыстаў з паэтычнымі творамі, а таксама цыркавыя праграмы й імпрэзы для дзяцей. Сымфанічны аркестар фармальна ў гэты пералік не трапляе. Дый нават з улікам тых зьніжак кошт арэнды для яго непад’ёмны. Прыкладам, за канцэрт у залі Дому афіцэраў трэба заплаціць 1616 эўра. З улікам зьніжкі 0,5, усталяванай для артыстаў беларускай эстрады, плаціць давядзецца «ўсяго толькі» 808 эўра. Адкуль узяць гэткія грошы, калі квіток на сымфанічны канцэрт каштуе самі ведаеце колькі?

## Фае з фантанам

Аднак філярманічнае кіраўніцтва не наважваецца наракаць на сквапнасьць роднае дзяржавы. Хаця б таму, што 1 лістапада ў будынку пачаўся капітальны рамонт з рэканструкцыяй інжынэрных сетак, на які ўрад абяцаўся выдаткаваць 7,5 млрд. рублёў. Пастанову «Аб капітальным рамонце будынку Белдзяржфілярмоніі» Генадзь Навіцкі падпісаў яшчэ ў лістападзе 2001 г., калі на сцэну зваліўся чарговы кавалак тынкоўкі.

Праект рамонту быў распрацаваны з размахам — апрача неабходных мерапрыемстваў па рэанімацыі будынку, плянавалася палепшыць акустычныя ўмовы (у тым ліку — абсталяваць залю спэцыяльнымі акустычнымі крэсламі), зрабіць усе неабходныя прыстасаваньні, каб Філярмонію маглі наведваць інваліды, пабудаваць новую камэрную залю, а фае ўпрыгожыць фантанам. Не забыліся і пра рэканструкцыю аргану, які не працуе ўжо гадоў зь дзесяць.

Тым часам філярманічныя калектывы мусілі шукаць сабе іншы прытулак. Сымфанічны аркестар уладкаваўся ў глядзельнай залі кінатэатру «Сучасьнік». Сцэна там малая, акустыка дрэнная, сьвятло цьмянае, так што музыкі псуюць сабе зрок, чытаючы ноты. Узімку халодна — давялося ўсталяваць у залі моцныя ацяпляльнікі, якія патыхалі газай і алівай ды шумелі.

Мо калі б у Філярмоніі на той час быў дырэктар, сытуацыя была б іншая. Аднак яшчэ ў лютым 2002 г. Міністэрства культуры не працягнула кантракту зь Ігарам Андрэевым. Ад ягоных паслугаў адмовіліся найперш таму, што ён не забясьпечваў паступленьня сродкаў ад арэнды. Фактычна ж Андрэева вызвалілі ад адказнасьці за катастрафічны стан філярманічнага будынку. Абавязкі дырэктара стаў выконваць Восіп Турко — чалавек часовы, а таму й нядзольны даць рады праблемам.

Для дзяржавы гэткі варыянт максымальна выгодны. Кінатэатар «Сучасьнік» даўно ўжо быў стратным. Яго закрыцьцё і разьмяшчэньне ў будынку філярманічных калектываў (сымфанічнага аркестру, народнага аркестру імя Жыновіча, народнага хору) дапамагло дзяржаве зэканоміць нейкія грошы. Але музыкі ў «Сучасьніку» мадзеюць.

## Красьніцкі едзе ў Брусэль

Але «Менская вясна-2003» усё ж адбылася. Не бяз значных высілкаў з боку новага дырэктара Філярмоніі Аляксея Шута, які адначасова зьяўляецца мастацкім кіраўніком і галоўным дырыжорам музычнай капэлы «Sonorus». Афіша фэсту была сьціплая, але зафіксавала ўсё ж колькі годных імпрэзаў.

Распачынаўся фэст сымфанічным канцэртам у гонар 130-годзьдзя Сяргея Рахманінава. Галоўным героем канцэрту быў ляўрэат прэстыжных конкурсаў піяніст Канстанцін Красьніцкі. У суправаджэньні Дзяржаўнага сымфанічнага аркестру ён сыграў Другі фартэпіянны канцэрт Рахманінава. Гэты выступ — рэпэтыцыя напярэдадні ягонай паездкі ў Брусэль на аўтарытэтны Міжнародны конкурс імя каралевы Элізабэты. Сам факт удзелу ў гэтым спаборніцтве вельмі пачэсны для любога маладога музыкі. Выступ Красьніцкага засьведчыў, што ён гатовы да барацьбы за ляўрэацкую ўзнагароду. Нягледзячы на пару крыўдных замінак, піяніст сыграў амаль дасканала — цікава і жыва, прыгожым ясным гукам, з сардэчным, шчырым адухаўленьнем.

Чаго ня скажаш пра ягонага калегу Аляксандра Анісімава-малодшага, які 15 красавіка граў Першы фартэпіянны канцэрт Пятра Чайкоўскага ў паўнюткай залі Опэры. Акампаніяваў Аляксандар Анісімаў-бацька зь філярманічным аркестрам. Анісімаў-малодшы граў нудна, дый ягоная піяністычная тэхніка, нягледзячы на марку Парыскай кансэрваторыі, пакідала жадаць лепшага. Затое піяніст старанна кланяўся, выцягваючы з публікі знакі ўхвалы. І хоць воплескаў не было задужа, падараваў слухачам «біс», пра які яны не прасілі. Калі б не Чацьвертая сымфонія, якую зайграў аркестар (без удзелу саліста), імпрэза б не ўдалася.

Сольны канцэрт піяніста Андрэя Сікорскага, «Усяночнае дбаньне» Рахманінава ў выкананьні Капэлы імя Шырмы, творчы вечар Рыгора Суруса з удзелам Дзяржаўнага сымфанічнага аркестру і капэлы «Раніца» адбываліся ў Акадэміі музыкі. А вось кампазытар Андрэй Мдзівані наладзіў выкананьне сваёй кантаты «Паўночныя кветкі» на вершы зь Бібліі, Авідыя, Жукоўскага і Бальмонта ў памяшканьні Расейскага тэатру. Выконвалі яе артысты музычнай капэлы «Sonorus». Фэстывальныя канцэрты адбываліся таксама ў Касьцёле Сьв.Тройцы. Вандравалі музыкі, як цыганы. Мо хоць налета, на «Вясну-2004», запросяць яны нас у абноўленую залю Філярмоніі — з арганам, фантанам і помпай.

**Юлія Андрэева**

М У З Ы Ч Н Ы Я І М П Р Э З Ы

## Легенды-2

**20 траўня ў Палацы культуры вэтэранаў (вул.Янкі Купалы, 21) адбудзецца прэзэнтацыя другога выданьня альбому «Легенды Вялікага Княства» — наміната сёлетняе «Рок-каранацыі».** У канцэрце возьмуць удзел гурты «Стары Ольса» (прызэр «Каранацыі»), «Кантраданс», «Кудзьмень» і інш. Пачатак а 19-й. Квіток каштуе 4 тыс. рублёў. Фалькавую тэму працягне Юры Выдронак з сваім гуртом «Ur’ia». На тым самым тыдні, у нядзелю 25 траўня, гэтая фольк-рок-шоў-каманда адыграе ў Тэатры юнага гледача свой першы сольны канцэрт. Пачатак у 19.00.

## Травеньскі акорд

**28 траўня будзе сьвята для аматараў бардаўскай песні.** У гэты дзень пройдзе фэст «Травеньскі акорд», у часе якога сваё веданьне акордаў прадэманструюць Алесь Камоцкі, Зьміцер Бартосік, Эдуард Акулін, Андрэй Мельнікаў і іншыя барды. Адбудзецца канцэрт у Доме літаратара (вул. Фрунзэ, 5) — зусім як у старыя добрыя першыя гады кіраваньня ППРБ. Пачатак у 19.00. Квіток каштуе 4 тыс. рублёў.

## Адбор на «Басовішча-2003»

**Калі вы граеце рок па-беларуску і маеце жаданьне засьпяваць на сапраўднай сцэне й акунуцца ў вудстокаўскую атмасфэру сапраўднага рок-фэсту — маеце шанец ажыцьцявіць сваю мару.** БМА-group распачынае прыём запісаў для ўдзелу ў конкурсным адборы на «Басовішча-2003». Адборачны тур пройдзе ў чэрвені ў адным зь менскіх клюбаў. Разам з канкурсантамі зайграюць пераможцы леташняга «Басовішча» (гурт «Partyzone») ды іншыя вядомыя выканаўцы. Каб узяць удзел у конкурсе, трэба даслаць свой запіс (20 хвілінаў) на адрас: а/с 5, 220085, Менск. Апошні тэрмін — 20 траўня 2003 г. Дадатковая інфармацыя па т.: (8-029) 649-08-88, пэйдж.: 211-85-85 (аб. БМА).

# Апэрацыя «Спэцпрыз»

**Сярод намінацыяў «Рок-каранацыі» быў і спэцыяльны прыз ад «НН». Атрымаў яго сёлета — за ўмацаваньне сяброўства між народамі Беларусі — музыка, ды-джэй і тэлевядоўца Аляксандар Памідораў.**



АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

25 красавіка 2003 г. — у дзень каранацыі — я адтачыла сваё красамоўства, падрыхтавала кароткі й энэргічны сьпіч, апранулася ў меру сьціпла і сэксапільна, памалявала твар і давяла да ладу фрызуру. Пасьля зайшлася ў рэдакцыю, дзе атрымала на рукі прыз — гіпэрклясную кнігу «Краіна Беларусь», а таксама грошы на кветкі.

Памідораў — асоба з тонкім і складаным унутраным сьветам, «шматслойны, бы цыбуля». Таму і кветкавая кампазыцыя мусіла быць экстраардынарнай. Кася Камоцкая выказала ідэю набыць зялёную галінку зь пяцьцю дасканалымі памідорамі. Пасьля мы вырашылі, што ікебана мусіць мець растаманскія калёры — і таматы былі ўкладзеныя за пругкія зялёныя голькі эўкаліпту, вакол вяночкам леглі жоўтыя хрызантэмы — найлепшыя ў Менску, яшчэ адным вяночкам дзяўчаты з кветкавай крамы ўклалі пышную расьліннасьць, якая нагадвала кроп і называлася падобна. Усё разам мы спавілі ў супэрскую паперу. Ад кампазыцыі было не адарваць вачэй. Да таго ж усе элемэнты ікебаны можна ўжыць у практычным сэнсе — эўкаліптам парыцца ў лазьні, памідоры і кроп зьесьці, а хрызантэмамі цэлы месяц упрыгожваць хату. Кветачнікі ж, калі ўведалі, каму мы зьбіраем букет, былі ўражаныя і шчасьлівыя: Памідораў іхны любімы ды-джэй. Значыць, «НН» не прамахнулася ў выбары і прыз дастанецца сапраўднаму народнаму артысту.

Пасьля мы выпілі па піву і накіраваліся ў «Казу», дзе мелася быць цырымонія. Я атрымала сапраўдную асалоду, лёгка мінуўшы суворую ахову. На ранейшыя каранацыі даводзілася прарывацца рознымі складанымі спосабамі.

Але тут мяне і чакаў удар! Сп.Памідораў нечага пакрыўдзіўся на арганізатара канцэрту сп.Цыбіна (ці наадварот) і адмаўляецца прыйсьці на цырымонію. Так я апынулася ў буфэце «Казы» з букетам і вялікай кніжкаю, як дурань зь дзьвярыма. Шматлікія музыкі і калямузыкі, якія абселі буфэт і абураліся несправядлівым размеркаваньнем «каронаў», суцяшалі мяне як маглі. Яны прапанавалі мне памідорамі ды псэўдакропам закусіць, а кнігу забраць сабе ў якасьці кампэнсацыі.

Але я патэлефанавала сп.Памідораву, які, выяўляецца, сядзеў непадалёк ад «Казы» ў аўтамабілі. Ён пагадзіўся прыйсьці. У суправаджэньні музыкаў, гукарэжысэраў, кінэматаграфістаў і журналістаў я стрэла Аляксандра на ганку «Казы». Пад ухвальныя воплескі й галёканьне аховы, якая трохі ссумавалася, стоячы бяз справы, прыз быў уручаны. Мой сьпіч быў яшчэ больш кароткі й энэргічны, чым меркавалася. Сказаўшы Памідораву, што яго цэніць «НН», што ён быў вельмі актыўны і пасьпяховы сёлета, пахваліўшы дыск і прыгадаўшы музычныя традыцыі народаў Беларусі, я палезла цалаваць ляўрэата, які выглядаў у той вечар так эфэктна і імпазантна, што ўтрымацца было немагчыма.

Хваляваньні, зьвязаныя з уручэньнем прызу, улегліся, Памідораў трыюмфальна далучыўся да буфэтнай брацііі. Я была ў эўфарыі ад свайго сьціплага, але элеганцкага экшэну. А праз некалькі дзён на сайце Памідорава зьявіўся запіс, дзе ён выказвае лобоў да пяці памідораў: «Вельмі прыемна было атрымаць спэцпрыз ад «Нашай Нівы». Супэр-кніга і супэр-ікебана зь пяцьцю памідорамі на адной галінцы!!! Нашыя прывітаньні і шанаваньні «Крамбамбулі» з нагоды перамогі па выніках мінулага году!»

Квіткі за кветкі я прынясу ў бухгалтэрыю пры першай нагодзе. Сьпірытусовыя напоі і жуйку, ужытыя мною пры выкананьні місіі, я набывала за свой кошт і кампэнсацыі не патрабую. Дзякую за высокі давер і дадзеную мне магчымасьць пазабаўляцца. У залі я таксама пабывала і адзначаю: удзельнікі «Крамбамбулі» былі сапраўды ў форме, пра што я скінула ім sms’ку.

**Сьвятлана Курс**

**Рэдакцыя далучаецца да віншаваньняў удзельнікам «Крамбамбулі».**

# Захад ёсьць Захад

**Працяг са старонкі 3.**

24-й. У Менску такога ня стрэнеш, бо ў Менску няма й такога капіталізму.

* * *

Берасьцейшчына, як і любы рэгіён, любіць землякоў. (Дзяўчынка з Расны, Алеся Шкурдода, нядаўна выйграла сусьветны конкурс дзяцейвыканаўцаў у Лос-Анджэласе — Берасьце на вушах стаяла.) Але кіраваць Берасьцейскай вобласьцю ў савецкі час традыцыйна ставілі віцебцаў ці магілёўцаў: апошнімі — Сакалова, Зеляноўскага. Слова «магілёўскі» выклікала ў мясцовых элітаў алергію ўжо тады. Затое свайго земляка Заламая берасьцейцы пасьля шанавалі надзвычай і мо таму ніяк не палюбяць чужынца Даўгалёва (ён з Рагачова). Самы нелюбімы губэрнатар краіны. Чаго пра яго толькі не распавядаюць. Ён і сам дае прыкурыць. Рапартуе на сэлектарнай нарадзе і ў мясцовай газэце аб сканчэньні сяўбы. Выяжджаю ў вёску — там сеюць ва ўсю. Праўда, вакол шашы сапраўды абсеяліся. Усё зноў як пры вялікім Машэраву, калі найбольш дбалі пра ахайнасьць агароджаў уздоўж шасеек.

У цэлым «пасяўная» мала цікавіць мясцовыя выданьні. У Берасьці зайздросная канкурэнцыя прэсы, рэгіянальныя газэты прадаюцца ў кожнай краме, на кожным аўтобусным прыпынку. Беларускамоўная «Народная трыбуна» найтаньнейшая. Каштуе 100 руб., мае наклад 13 тыс. асобнікаў. Няма незалежных беларускамоўных газэтаў. Пасьля прыняцьця новага закону аб рэлігіях страціла магчымасьць выходзіць і ўніяцкая парафіяльная «Царква», якую чыталі далёка за межамі парафіі. Цяпер асобныя парафіі ня маюць права выдаваць газэты, гэта можа рабіць толькі царква. Апошняя навіна: рэдактара дзяржаўнае «Зары» Пятра Цішука (былога намесьніка старшыні пінскага гарсавету дэмакратычнага скліканьня) зьнялі з пасады, не пратрымаўшы і 100 дзён. Прычынай звальненьня мог быць скандал: баранавіцкія актывісты апазыцыі судзіліся з газэтай, якая абылгала іх, і выйгралі працэс. А Цішук не падаў на апэляцыю. Яшчэ адна вэрсія: напярэдадні 85-е гадавіны БНР у газэце зьявіўся артыкул «Яна была ў нашай гісторыі», нэрвова ўспрыняты ў аблвыканкаме.

Парлямэнцкі карэспандэнт самай папулярнай газэты, муніцыпальнага расейскамоўнага «Вечернего Бреста», які выходзіць накладам 33 тыс. асобнікаў на 300-тысячны горад, гутарыць з генэралам Фраловым. Той расказвае пра сваю паездку ў Францыю.

Берасьцейцы ж галасуюць «за дастойнае жыцьцё» коламі. Пятая частка людзей жыве з Польшчы — гандаль, мытня. У адрозьненьне ад дачнае, гандлёвая праца, як і прыватны капітал, спрыяе інтэлектуальнаму разьвіцьцю. Што стане пасьля ўвядзеньня візаў, ніхто не бярэцца прадказаць.

Дэпутаты з групы «Рэспубліка» ўсе збольшага з паўночнага Захаду. Фралоў з Горадні, Баслык з-пад Мядзелу, Парфяновіч і Скрабец зь Менску... Чаму ж не з капіталістычнага Берасьця?

Старэйшыя апазыцыянэры ў Берасьці застаюцца ізаляваным асяродкам. Людзі адыходзяць — на днях памёр мясцовы лідэр АГП Генадзь Самойленка. Згас ад раку, у перадсьмяротным лісьце абвінаваціў у сваёй гібелі спэцслужбы. Бо ад тае самае хваробы загінуў берасьцейскі лідэр БНФ Уладзімер Базан.

Ізаляцыі не адчуваецца затое ў асяродках моладзі. Тамака кіпяць ідэі. Апошняя задума каардынатаркі «Зубра» па Берасьцейшчыне Паліны Панасюк і кіраўніцы грамадзкае ініцыятывы «Стары горад» Ірыны Лаўроўскай — праект аднаўленьня бернардынскага кляштара, разбуранага расейцамі падчас будаўніцтва крэпасьці. Сапраўды мог бы выйсьці праект дзесяцігодзьдзя.

«Цяпер ужо не пара на адраджэнскія газэты, іх час прайшоў», — кажа мне адзін хлопец. Памыляешся, дружа. Адраджэнства адраджэнствам, а безь беларускага духу твая газэта нікому ня стане патрэбная.

Дэмакратычнаму руху на Берасьцейшчыне замінае нераспрацаванасьць такой мадыфікацыі нацыянальнай ідэі, якая б апаноўвала і беларусаў іншаэтнічнага паходжаньня. Этнічны нацыяналізм, які падзяляе людзей паводле запісу ў пашпарце, пакідае берасьцейцаў пераважна абыякавымі, а грамадзянскі пакуль нераспрацаваны. Пакуль.

* * *

Моўная русіфікацыя на захадзе і ўсходзе зайшла амаль аднолькава далёка, а вось русіфікацыя культурная на захадзе нашмат меншая. Таму і сьмецяць менш, і зямля дае лепшую аддачу. Гісторыя нібы разьліта ў духу прасторы. Колькі там у Берасьці ўніятаў? Ну, сто чалавек. Але пра ўніятства памятаюць. Маюць, так бы мовіць, на ўвазе.

У праваслаўнага ярэя Івана Грудніцкага хацелі забраць багаты прыход на Кавалёўцы. Начальства вінавацiла яго ў дарэмным развodзе і паўторнай жаніцьбе з маладкай. Ярэй закідаў духоўнаму кіраўніцтву разбэшчанасьць і несправядлівасьць. Зрэшты, гэта няважна, вечны канфлікт. Цікава іншае: калі прыціснула, Грудніцкі кінуўся куды? У Аўтакефальную царкву. А яе няма. Тады да ўніятаў. Толькі тыя не займаюцца перацягваньнем сьвятароў і ветліва адмовілі. Урэшце прыйшлося Грудніцкаму скарыцца і выехаць на сьціплы прыход у вёску. Так, мірам, справу замялі.

Замест уладыкі Сафронія, які ўцягнуўся ў вялікія канфлікты ў Берасьці й Ружанах, прыслалі новага япіскапа Івана. «Не дапусьцім уніятаў да царквы!» — узьнялі пратэст прыхаджанкі-дысыдэнткі. Хтосьці пусьціў пагалоску, што Іванаў родны дзядзька ўніяцкім біскупам у Рыме. Сапраўды, біскуп Хома апякуецца там сэмінарыстамі. У цэлым япіскапа Івана ў Берасьці прынялі добра, лічаць інтэлектуалам. Усьцешаныя ў Берасьці, дарэчы, і новым рэктарам Часноўскім — бо дэмакратычны, інтэлігентны, сталічны. Такія якасьці зноў у цане.



IREX-PROMEDIA

**Адлюстраваньне губэрнатара Даўгалёва**

Самі ж уніяты збудавалі сабе на Рэчыцы капліцу і гасьцёўню над ёю. Цяпер яе не абмінае ніводны шаноўны госьць зь незалежных. Апошнімі былі кіраўнікі Саюзу пісьменьнікаў і рэдактары «Дзеяслова». Ці ўкленчаць падчас імшы, гадалі ўніяты? Айцец Ігар Кандрацьеў служыць паводле злацінізаванага, базыльянскага абраду, у якім вернікі падоўгу стаяць на каленях. Укленчылі.

* * *

Захад Беларусі ніколі ня быў багацейшы за ўсход, але заўжды быў больш стракаты этнічна, рэлігійна, дыялектна, нават разнастайны ляндшафтна, і ад таго больш адкрыты. Да непазьбежнага рыўку на Захад беларускі захад быў гатовы лепш. Можна сказаць — заўжды гатовы.

**Андрэй Дынько**

# Дэпалітызаванае пакаленьне


Зьлева направа: Арцём Арашонак, Юлія Шастак, Павал Хадынскі.

Працяг са старонкі 1.

моўнае асяродзьдзе і цяпер добра разумею, як адчувае сябе беларускамоўны чалавек у цалкам расейскамоўным асяродзьдзі». Журы, паводле агульнага прызнаньня, «купілася» на верш, дзе згадвалася «адна шостая частка сушкі» ды «адна пятнаццатая частка радзімкі». Сам жа Дзьмітры з патасам чытаў на вечарыне: «Гордо по земле несу // то, что выносил в носу».

Агрэсіўны наступ аўтараў-нетрадыцыяналістаў, у творах якіх было шмат *сэксу, гвалту і слэнгу*, выклікаў у сэмінарыстаў-традыцыяналістаў хвалю абурэньня. Навошта гэта цягнуць у вершы, калі гэтага навокал і так дастаткова? Спрэчка вечная, і хутчэй маральная, чым літаратурная. Пагатоў, не на ўсіх нават удзельнікаў сэмінару «жорсткія вершы» зрабілі такое кепскае ўражаньне. Так, досыць традыцыйная ў сваёй творчасьці, жаноцкая, бы тая фіялачка, **Юлія Шастак** выказала нават жаданьне паспрабаваць свае сілы ў гэткай паэтыцы. Дарэчы, Юлія навучаецца на архітэктара. А самы яркі вобраз, створаны паэткай, — «каханьне, якое ішло горлам на белы сьнег».

Другі зь «нетыповых традыцыяналістаў» — віцяблянін **Арцём Арашонак**, аўтар хайку, што друкаваліся ў «НН». Як высьветлілася на сэмінары, Арцём апроч хайку піша карацелькі — афарыстычныя вершы ў прозе. А яшчэ — займаецца перакладамі на нямецкую і зь яе. Так, на нямецкую ён перакладае вершы Янкі Купалы, Алеся Разанава, а зь нямецкай — творы Бёля, Гесэ.

Перакладамі хоцькі-няхоцькі мусілі заняцца й іншыя ўдзельнікі сэмінару. Такім было адно з «хатніх заданьняў» (яшчэ трэба было напісаць прысьвячэньне Н.Арсеньневай, санэт на тэму, зададзеную радком зь вершу Н.Арсеньневай «Ня плачце... Не таму, што сьлёз шкада», а таксама пародыю ці эпіграму на адвольную тэму). Магчыма, пасьля ўдалых першых спробаў у нас пабольшае перакладчыкаў з польскае (Ю.Шастак), украінскае (А.Чубат, С.Прылуцкі), расейскае (Г.Лабадзенка) паэзіі. Выказаў цікавасьць да перакладу і Д.Дзьмітрыеў: «Мне хацелася б перакласьці па-беларуску Ўладзімера Гурвіча ці Генадзя Айгі».

Старшыня журы, доктар філялёгіі Міхась Тычына лічыць супольнай рысай наймаладзейшага пакаленьня творцаў дэпалітызаванасьць і пэўную безасабовасьць. «Нейкая глыбіня, структура прамаўляе іхнымі вуснамі, а не яны самі. Для мяне былі цікавымі і паказальнымі першыя спробы Дзьмітрыева пісаць па-беларуску — нягледзячы на тое што ён яшчэ не гаворыць па-беларуску, у яго выйшлі добрыя творы. Праз іх прамаўляе глыбінная аснова, прырода, гісторыя».

Якія парады давала тэмамі заняткаў (што доўжыліся да 12 гадзінаў у дзень) журы конкурсу? Актыўней спазнаваць сьвет і краіну ды насычаць творы ведамі, вучыцца выступаць на публіцы, кантактаваць з выдаўцамі й выданьнямі, практыкавацца ў несур'ёзных жанрах, перакладаць — і больш чытаць на замежных мовах, узбагачаць мову. Фіналісты ўспрымалі парады з здаровай доляй маладога скептыцызму. І насілі за сабой гітары.

Як вырашыла журы, з твораў фіналістаў конкурсу будзе ўкладзены зборнік.

**Адам Воршыч,**
**фота Андрэя Лянкевіча**

**P.S.** Старонка вершаў удзельнікаў конкурсу будзе надрукаваная ў наступным нумары «НН».


**Майстар-клясы на Спатканьні маладых літаратараў вёў Андрэй Хадановіч**


**Дзьмітры Дзьмітрыеў:**
«лампочки от напряженья и тоски
рвут на себе вольфрамовые волоски»


**Вальжына Морт:**
«Мы надта маладыя,
каб жыць,
і старыя, каб
ісьці на вайну.
Наш занятак —
хутчэй астыць.
Наша справа —
пайсьці ка дну».

---

Сярод іншых творчых заданьняў для фіналістаў конкурсу імя Натальлі Арсеньневай было й напісаньне санэту на першы зададзены радок. Ім стаў радок Арсеньневай «Ня плачце… Не таму, што сьлёз шкада…». Публікуем санэты некаторых канкурсантаў.

**Андрэй Хадановіч**

## Вольга КАЛЕНІК

* * *

Ня плачце... Не таму, што сьлёз шкада,
А проста дождж не разьліецца морам,
Дзе патанулі б ганьба, страх і гора, —
Іх век-вяком ня збыць ды не аддаць.

Нягоды, што нясуцца па сьлядах,
Цераз плячо нашэпчуць шлях да зораў
І лёс аздобяць вычварным узорам,
І змусяць шчэ ня раз сябе згадаць.

Захопленым бясконцасьцю дарог
Жыцьцё разгорне Млечны Шлях ля ног
Датуль, пакуль сузор'і не астынуць.

Ёсьць праўды спасьціжэньне ў барацьбе,
А сэнс — у тым, каб навучыць сябе
Любіць жыцьцё і з прысмакам палыну.

## Алег НІКУЛІН

* * *

Ня плачце... Не таму, што сьлёз шкада
У час драпежнай зайздрасьці і здрады.
Калі імкнуцца з гонарам да праўды,
Ня трэба думаць, што яна — бяда.

Вам сумна, бо пракляты лёс ізноў
Рыхтуе д'яблу новую ахвяру,
Зьнішчае вашу спраўджаную мару
І часта пазбаўляе вольных сноў.

Краіна, па якой душа баліць,
Ня можа быць адрынутай і вамі —
Яе гаспадарамі — змагарамі,

Бо ў цемры вечнай немагчыма жыць,
Сабе з хлусьні ствараючы багоў
Бяз будучай дзяржавы і сьцягоў.


**Ірына Поўх (зьлева) і Вольга Каленік**

## Ірына ПОЎХ

* * *

Ня плачце... Не таму, што сьлёз шкада, —
ня выплакаць усё адно ўсе сьлёзы:
нібыта ў сэрца ўбілася занозай
зарумзанае восені слата.

Калі ня маеш, лёгка ўсё аддаць,
укрыжаваць на вершы або прозай
сваю душу. Пра марныя пагрозы
зануды часу нават не згадаць.

Праводзіць на спачын гады гадзіньнік,
заблытвае хвілінак павуціньне.
Паклічаш, і здаецца на хвілінку:

дзяцінства на твой голас адгукнецца
і шчэ адна знаёмая сьцяжынка
на твары зморшчынкаю адаб'ецца.

## Сяргей ПРЫЛУЦКІ


ГЛЕБ ЛАБАДЗЕНКА

### Хаўтурны санэт

Ня плачце... Не таму, што сьлёз шкада.
Што сьлёзы ў параўнаньні з гэткай стратай!
Памёр Калян. Гавораць, ад інфаркту,
хоць я дакладна ведаю — «Агдам»

дабіў яго. Быў добрым суразмоўцам
і як ніхто гуляў у даміно;
любіў глядзець савецкае кіно
і ўладу лаяць нецэнзурным слоўцам.

Няма, Андрэю, адышоў, Ахрэме,
наш рыцар пляшкі й шклянкі назаўжды;
на дне жыцьця быў капітанам Нэма —

плыў немавед навошта і куды.
Памрэм ад п'янства, як і ён, — няхай.
Што нам губляць?.. Сьцяпане, разьлівай!

## Віка ТРЭНАС

### Безгаловы санэт

Ня плачце... Не таму, што сьлёз шкада.
Бо не ад іх трава расьце вясною.
Узрошчаная сном і цішынёю,
Сьцякае зь веяў марная вада.

Ня будуць болей сонечныя промні,
Ружовыя ад шчасьця і ад стомы,
На твары палымнець расталым сьнегам.

Ня плачце. Усьміхаюся балесна
Я не таму, што хутка стану небам, —
Мне сьлёз шкада, якім у зрэнках цесна.

## Валерыя ШУГАЛА

* * *

Ня плачце... Не таму, што сьлёз шкада:
Над хвалямі сінеючага Нілу
Бяз вас, паверце, хопіць кракадзілаў,
З чыіх вачэй — салёная вада.

Ня плачце... Што ж вы плачаце, спадар,
Бы Таня, што свой мячык утапіла?
Слязьмі ня вернеш страчаную сілу,
Калі заснуў навек мужчынскі дар!

Мужайцеся! Масква сьлязам ня верыць!
Яшчэ ня ўсе зачыненыя дзьверы!
Таму ня трэба плакаць, як бабёр.

На сьвеце можна жыць і без жанчыны.
Жыве вунь Аляксандар ібн Рыгор,
Заместа жонкі маючы краіну.

Алесь Кудрыцкі

# Зь вялікай літары

Дзявятага траўня. Дзявятая гадзіна раніцы. Ты ідзеш знаёмым шляхам па цэнтры места. Вымытыя вуліцы пахнуць вільготным асфальтам. Прыглушаны гук вайсковых песьняў з далёкіх дынамікаў блытаецца з шыпучымі загадамі рацыі ў руках самотнага міліцыянта на скрыжаваньні.

Бязьлюдныя завулкі кантрастуюць з галоўным праспэктам, што поўніцца народам, збольшага школьнікамі. Дзе-нідзе — піянэры ў невядомай табе бела-зялёнай уніформе. Грамада ня дужа гаманкая, бо яшчэ не зусім прачнулася. Блакітных камуфляжаў амаль не відаць, але міліцыі шмат. Яна ў цывільным — з бэджыкамі. Бабулькі ля пераходаў няблага прыгандлёўваюць кветкамі. Найлепш разыходзяцца чырвоныя цюльпаны. Усе чакаюць пачатку.

Ты ідзеш уздоўж праспэкту, аздобленага нечакана сьціпла і неяк не па-савецку. Аранжавыя зоркі сярод align="" рознакаляровых сьцяжкоў на ліхтарных слупах нагадваюць часьцінкі фаервэрку. Выключэньне — хіба што вялізны чырвоны сьцяг зь сярпом ды молатам на тэлевежы.

Натоўп робіцца ўсё больш шчыльным. Ты спрабуеш праціснуцца ў бок Палацу Рэспублікі, але шлях перакрыты. З гары, на якой месьціцца Кастрычніцкая плошча, ужо спускаецца калёна. Чырвань сьцягоў ды золата трубаў. Побач з савецкім сьцягам марфлёту — расейскі андрэеўскі блакітны крыж.

Калёна падыходзіць бліжэй, і ты не разумееш, чаму вэтэранам патрэбная такая ахова — дзядзькі ў чорных гарнітурах ды чорных акулярах, з дроцікамі, што цягнуцца ад вуха за каўнер. У натоўпе адзінкавыя воплескі — мабыць, «завучы», якія ведаюць, хто ідзе ў першым шэрагу, спрабуюць «завесьці» публіку. Аднак «галава» праходзіць збольшага незаўважаная, а вось першую вялікую калёну вэтэранаў сустракаюць нашмат весялей.

У калёне няма маладых вэтэранаў сучасных войнаў. Ты спадзяешся, што ніколі іх не пабачыш. Пасьля Аўганістану беларусы, лічы, не ваявалі.

Здаля па-над калёнаю выглядае эмблема «Макдональдзу». Ці за гэта змагаліся тыя, хто ідзе пад чырвонымі сьцягамі? Унук здымае дзядулю на лічбавы фотаапарат. Відаць, пасьля вэтэран зводзіць яго ў той самы «Макдональдз» з нагоды сьвята. Значыцца, і за гэта таксама.

«Паважаныя грамадзяне, сыдзіце з праезнай часткі, адкрываецца рух». Па тратуары пусьцілі машыны. Мабыць, вайсковы парад будзе ў ліпені. Са сьвята Перамогі акцэнт зьмясьціўся на сьвята Вызваленьня. Усё-такі Менск бліжэйшы за Бэрлін.

Месты паволі напаўняецца людзьмі. Вайсковы аркестар, які гадзіну таму граў для пустой плошчы, ужо мае тысячы слухачоў-мінакоў. Ты дзівуешся таму, што на вуліцах зусім мала вэтэранаў. Летась было болей. Зрэшты, ты думаеш тое кожны год.


АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

А 13-й крочыш да помніка Перамогі. Тут таксама поўна людзей. «Віка, давай-ка сюды», — заклапочана кажа пэнсіянэр унучцы. Малая ня слухаецца і працягвае сачыць за тым, як разгортваюць бел-чырвона-белыя сьцягі з крыжамі, насаджваючы іх на дрэўкі. Тузін людзей са знаёмымі тварамі падыходзяць да помніка ўскласьці кветкі. Акрамя загадзя папярэджаных карэспандэнтаў, мала хто разумее, што адбываецца. Бабулькі-вэтэранкі спачатку ганяць «нацыяналістаў», а потым пачынаюць віншаваць іх са сьвятам. Пяць хвілінаў — і маленькая працэсія сыходзіць. «Прэдатвращаем, толькі па-быстраму» — каманда па рацыі. Кароткія перамовы, сьцягі схаваныя. Нікога не затрымалі.

Ты крочыш дахаты і ўзгадваеш «Доўгую дарогу дадому» Васіля Быкава: «Вайна — бадай, скрозь чалавечае няшчасьце…» У плыні ўспамінаў Быкава канец вайны губляецца — так стомлены чалавек амаль не заўважае канца цяжкой дарогі, ня радуецца яму, а толькі шукае прытулку. Але слова Перамога Быкаў піша зь вялікай літары.

# Памяці Аляксандра Кузьміна

Аднойчы на склоне рабочага дня ў рэдакцыі раздаўся тэлефонны званок, загадчык аддзелу Леанід Дзянісаў перадаў трубку мне. «Хто?» — «Ня ведаю». Я назваў сябе і пачуў глухаваты, разважлівы голас: «Гаворыць Аляксандар Трыфанавіч». (Я аж спалохаўся, падумаўшы, што гэта Твардоўскі, але чаму ён у Горадні?) Ды не, аказалася, то другі Аляксандар Трыфанавіч — новы сакратар ЦК КПБ па ідэалёгіі Кузьмін. Ён хоча спаткацца са мной, але неафіцыйна: можа б, мы пагулялі ўвечары па вуліцах, пагутарылі? Было лета, надвор'е стаяла добрае. Дамовіліся спаткацца.

То была мая першая сустрэча з гэтым чалавекам, які парушыў у маёй сьвядомасьці раней засвоеныя ўяўленьні пра партыйных функцыянэраў усіх без выключэньня рангаў. Мы хадзілі па ціхіх гарадзенскіх вулічках паблізу ад двух гістарычных замкаў, і Аляксандар Трыфанавіч ціхім голасам распавядаў пра сваю вайну, як быў на фронце лётчыкам-штурманам бамбардзіроўшчыка, як даводзілася лётаць, быць зьбітым. Распавёў пра выпадкі з асабістамі, якія, як і ўсюды, шчыравалі і ў авіяцыі. Ацалеў ён з гэтай вайны толькі праз тое, што быў цяжка паранены і сьпісаны. Інвалідам пачынаў цывільнае жыцьцё, памалу пайшоў па партыйнай лініі і вось дабраўся да ЦК. Цяпер ён кіруе ідэалёгіяй, у якой, аднак, нічога не вырашае, бо ўсё ў ёй вырашана — даўно і назаўжды. Накнот асьвятленьня вайны ў маіх творах ён цалкам на маім баку, але, як партыйны функцыянэр, на жаль, ня можа агучыць тое публічна. Я толькі пацiскаў плячыма — што ж, дзякуй і за такое прызнаньне. Мне ніхто ніколі, нават сакратар рэдакцыйнай партарганізацыі, не сказаў, што ён на маім баку. Хоць таксама быў вэтэран вайны, былы франтавік. Некаторыя часам гаварылі ў вочы, што яны супраць маіх «пісаньняў», бальшыня, праўда, мудра маўчала.

З тае сустрэчы ў мяне з АТК, як яго клікалі за вочы, склаліся прыязныя, амаль таварыскія адносіны. Чым мог, ён імкнуўся памагчы мне, таксама як і Алесю Адамовічу, што неўзабаве апынуўся бяз працы, выгнаны з Маскоўскага ўнівэрсытэту. Ды і шмат каму зь іншых.

**З успамінаў Васіля Быкава «Доўгая дарога дамоў»**

Аляксандар Кузьмін памёр 1 траўня і пахаваны ў Менску

# Янка Жамойцін



**Перад праваслаўным Вялікаднем ня стала беларускага грамадзкага дзеяча і пісьменьніка ў Польшчы, вэтэрана нацыянальнага руху Янкі Жамойціна.**

Ён нарадзіўся ў вёсцы Клімавічы на Лідчыне ў 1922 г. У 1930-я вучыўся ў Варшаўскай гімназіі, а падчас вайны — у Навагрудзкай настаўніцкай сэмінарыі. Па заданьні Беларускай незалежніцкай партыі працаваў у СБМ, быў яго акруговым кіраўніком у Навагрудку. Пасьля вайны жыў у Польшчы, стварыў сям'ю. Аднак у сьнежні 1949 г. Я.Жамойцін быў арыштаваны і дэпартаваны ў Менск. За прыналежнасьць да СБМ і БНП бальшавікі яго асудзілі на 25 гадоў канцлягераў. У Польшчу вярнуўся ў 1956 г., жыў у Варшаве, скончыў унівэрсытэт, браў удзел у беларускім культурным жыцьці. Быў вядомы як літаратурны крытык, напісаў успаміны, надрукаваныя ў зборніку «Лёс аднаго пакаленьня» (Беласток, 1996). У пачатку 1990-х дасылаў свае допісы ў «НН».

Яшчэ 5 сакавіка сёлета НТВ паказвала сюжэт з Варшавы, прысьвечаны ўгодкам сьмерці Сталіна. Пра тое, як сустрэлі гэтую вестку ў савецкім канцлягеры, распавядаў якраз Янка Жамойцін. Да апошніх дзён ён заставаўся вялікім беларускім патрыётам, шчырым вернікам і надзейным сябрам.

Сьветлая памяць!

**Сяргей Ёрш**

# Андрусь Белавокі

**8 траўня ўранку трагічна загінуў у аўтакатастрофе за Койданавам журналіст Андрусь Белавокі.** Адразу цяжка было паверыць, што ня стала гэтага жыцьцялюбнага няўрымсьлівага хлапца, заўсёдніка палітычных акцыяў, андэграўндных тусовак ды рок-канцэртаў, адзінага пашпартнага Андруся ў Беларусі. Ён сышоў маладым, пакінуўшы нас старэць.



# Веру Церлюкевіч памятаюць

**Чалавек жыве, пакуль яго памятаюць. Веры Церлюкевіч, якую многія бачылі на менскіх мітынгах 90-х, няма з намі ўжо два з паловай гады — яна памерла 31 сьнежня 2000 г.** Аднак пра спн.Веру не забываюць: ейная магіла на Паўночных могілках Менску мае сталы догляд. Гэтую місію ўзяла на сябе сяброўка КХП-БНФ Галіна Дзягілева. Яна прыяжджае на Паўночныя могілкі некалькі разоў на год. Абавязкова — на абодва Вялікадні, а таксама на дзень нараджэньня В.Церлюкевіч, 10 кастрычніка. «Вера і сама была вельмі ахайнай, — згадвае спн.Галіна. — У яе была сьціплая кватэра, але заўжды прыбраная. Дык таму і я хачу, каб ейная магіла была дагледжаная».



Сёлета сябры КХП-БНФ мяркуюць паставіць па Веры памятку. Яшчэ, праўда, ня вырашылі, ці гэта будзе пліта, ці проста крыж. Але гэта ўжо пытаньне тэхнічнае.

Непадалёк ад пахаваньня В.Церлюкевіч ужо стаіць адна беларускамоўная надмагільная пліта з «Пагоняй»: пад ёй спачывае Віктар Ермаловіч, які памёр у студзені 2001 г.

**АШ**

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ


### ПРАЦА

**У менскі садок** патрабуецца выхавацелька зь веданьнем беларускай мовы. Досьвед працы зь дзецьмі пажаданы (хоць бы з уласнымі). Т.: 234-50-25, 234-25-61 (Раіса Іосіфаўна або Лілія Вячаславаўна)

**Выкладчык фізыкі** з досьведам выкладаньня на падвышаным узроўні шукае працу ў беларускамоўнай школе. Т.: 263-70-69

**Дапамагу вырашыць** кампутарныя праблемы, усталяваць праграмы, правесьці мадэрнізацыю. Т.: 264-68-90

### ПРАДАМ МАШЫНУ

**«Хонда Канцэрта»** 1992 г.в., толькі зь Нямеччыны. 1,6 інжэктар, ГУ, ЭАП. Т.: 8-029-620-85-56

### ВІТАНЬНІ

**Shalom, Сонейка** маё, каханы мой валацуга. Хрыстос уваскрос! Хрыстос пасярод нас!.. Дзе б ты ні быў. Дзякуй Богу й табе, што ты ёсьць... ёсьць маім Сонейкам! Люблю, думаю, малюся... Тваё люстэрка

**Віншуем маладафронтаўцаў** з пачаткам кампаніі выдачы пасьведчаньняў. Нарэшце! Менскі МФ

### КАНТАКТЫ

**Любая мая!** Як ты даехала да г.Л? Я эльскар дэй. Emi svenska. Roxette. H.U.A. Rox

**Аддам кацянятак** у добрыя рукі. Т.: 243-98-10. Наталья

**Бацькі**, якія хочуць павесьці сваіх дзяцей у беларускамоўную пачатковую клясу, тэлефануйце. Т.: 288-23-52 (з 12 да 18.00), 288-68-91 (Ігар), 215-84-09 (Алесь, пасьля 20.00)

### КНІГІ, МУЗЫКА

**Кнігі — поштай— новае:** Аляксей Марачкін «Алесь MARA. Аўтаманаграфія», Васіль Быкаў «Доўгая дарога дадому», ARCHE №2-2003 «Туманнасьці беларускай гісторыі». Замаўляйце праз пошту — п/с 333, 220050, Менск; праз e-mail: exlibris@tut.by праз Internet: http://exlibris.cjb.net; праз тэлефон: 8-029-643-57-33

**Кнігі — поштай:** больш за 120 найменьняў беларускамоўнай прадукцыі — кнігі, відэа, музыка. Замаўляйце каталёг праз пошту — п/с 333, 220050, Менск; праз e-mail: exlibris@tut.by; праз Internet: http://exlibris.cjb.net; праз тэлефон: 8-029-643-57-33

**Часопісы «Роднае слова»** за 1996—2001 г. прадам. 28 у.а. Т.: 270-45-64

**Замаўляйце першы нумар** «Сьпеўніка Беларускага» па адрасе: akimycz@yahoo.com альбо праз пэйдж.: 211-85-85, аб.20830 (з пазнакай «сьпеўнік»), а таксама завітвайце па сьпевы сюды: http://bs.studenty.org

**Кнігаабмен.** Прапаную кнігі сучасных выдавецтваў. Шукаю рэдкія выданьні. Тэл. (8-029) 753-91-96

**Беларускія кнігі**, аўдыё, відэа, CD у Гомелі. Т.: 45-11-51; 632-88-52 (толькі SMS)

### НАБУДУ

**Альтовы блёк** хлет (флейту) фірмы «Jupiter» або лепшы — прынамсі, ня горшы. Т.: 247-13-40. Запрасеце пана Скіргайлу


# Камень дзесяцігодзьдзя




**На здымку (зьлева направа): Вінцэсь Мудроў, Алесь Аркуш, Лера Сом, Ігар Сідарук, Зьміцер Вішнёў, Ганна Кісьліцына, Сяржук Мінскевіч, Алесь Пушкін — аўтар ідэі з каменем і ляўрэат «Глінянага Вялеса» Альгерд Бахарэвіч**

**8 траўня сябры Таварыства вольных літаратараў адзначылі 10-годзьдзе сваёй арганізацыі.** З гэтае нагоды ў Полацку адбылася адмысловая імпрэза, падчас якой уручылі штогадовую прэмію «Гліняны Вялес». Сёлетні ляўрэат — Альгерд Бахарэвіч, празаік, творы якога прасякнутыя кафкіянскімі матывамі. Заключным акордам урачыстасьцяў сталася адкрыцьцё памятнага знаку ў традыцыі Барысавых камянёў: на базальтавым валуне, які ляжыць на беразе Палаты побач зь Верхнім Замкам, тэвээлаўцы высеклі сваю афіцыйную эмблему. Гістарычных мясьцінаў у Полацку цяпер паболела.

**Васіль Кроква**

## НОВЫЯ КНІГІ, ДАСЛАНЫЯ Ў РЭДАКЦЫЮ

**Аксак В. Віно з Каліфорніі: Вершы**. — Менск: Юніпак, 2003. — 72 с.




Паэтычныя блуканьні па розных гарадах сьвету, па рэальных геаграфічных і ўяўных духовых прасторах неадменна сканчаюцца вяртаньнем у Смалічы, на Нясьвіжчыну, дзе нарадзілася аўтарка. Гэты зборнік у паэткі чацьверты. Наклад — 500 ас.

**Дэклярацыя тысячагодзьдзя** / Арганізацыя Аб'яднаных Нацыяў. — Менск, 2003. — 16 с.

Выйшла па-беларуску «Дэклярацыя тысячагодзьдзя», прынятая Генэральнай Асамблеяй ААН на Саміце новага тысячагодзьдзя — самай прадстаўнічай у гісторыі ААН сустрэчы сусьветных лідэраў, што адбылася ў Нью-Ёрку ў верасьні 2000 г. У дакумэнце акрэсьлены шэраг практычных мэтаў, якіх павінна дасягнуць чалавецтва.

**І песьню родную люблю я**: Спэцвыпуск бюлетэню Баранавіцкага аддзяленьня ТБМ імя Ф.Скарыны «Люблю наш край» / Уклад. А.Горбач. — Баранавічы, 2003. — 44 с.

Беларусы здавён казалі: «Плакаў, плакаў — усё Бог аднакаў, а як стаў сьпяваць — стаў Бог даваць». Кішэнны сьпеўнічак сабраў пад адною вокладкаю тэксты 27 народных гітоў: «Сабралася бедна басота», «Касіў Ясь канюшыну», «Лявоніха», «Сваток», «Ручнікі», «Дзе мая Маруся», «Бывайце здаровы» й нават «Надзенька». Сьпявайма разам! Наклад выданьня — 250 ас.

**Краіна Беларусь: Ілюстраваная гісторыя**. — Martin, 2003. —320 с.: іл.

«Краіна Беларусь» створаная зь перакананьнем, што нашая мінуўшчына — неаддзельная частка гісторыі Эўропы, а таму й распавядаць пра Беларусь неабходна з годнасьцю.

**Савік Л. Адна між замкаў: Літаратурны партрэт Вольгі Іпатавай.** — Менск: БелСаЭС «Чарнобыль», 2003. — 180 с.: іл.

Літаратуразнаўчы агляд паэтычных ды празаічных твораў В.Іпатавай і партрэт аўтаркі як актыўнай грамадзкай дзячкі, беларускі ды проста чалавека. Пытайцеся на выставе ТБМ.

**Эмігрант. Выданьне беларускай палітычнай эміграцыі.** — 2003. —№1 (5). Наклад 299 асобнікаў.

У газэце, што выдаецца «Зьвязам беларускіх палітычных уцекачоў у Польшчы», уздымаецца шэраг розных праблемаў: вайна ў Іраку, Чарнобыль, беларуская мова, грамадзкія арганізацыі. Аднак стрыжнем, вакол якога будуецца амаль кожны матэрыял, зьяўляеццца асоба А.Лукашэнкі, на адрас якога аўтары не шкадуюць словаў. Выданьне пакідае ўражаньне пазачасавасьці: гэткае маглі пісаць і ў 1997-м, і ў 2001-м. Актуалізуе нумар хіба журботная зьвестка пра сьмерць магілёўскага праваабаронца Сяргея Абадоўскага, бацькі заснавальніка газэты. У рэдакцыйным артыкуле пішацца, што выданьне, як друкаваны орган «Зьвязу», мае на мэце спрыяць яднаньню беларускае эміграцыі ў Польшчы. Але сьледам стаіць папярэджаньне: «Калі дзеючай уладзе «Эмігрант» не выгодны, адразу робіцца зразумелай пазыцыя тых, хто выступае супраць газэты».

**Дух і Літера** /Національний університет «Києво-Могилянська Академія». — 2002. — №9—10.

У зборнік увайшлі матэрыялы Міжнароднай канфэрэнцыі «Сям'я ў постатэістычных грамадзтвах». З боку Беларусі ўдзел у мерапрыемстве брала Галіна Сініла з дакладам «Шлюб і сямейныя повязі ў асэнсаваньні тэкстаў Танаху (Старога Запавету)». Друкуецца і рэцэнзія на беларускі часопіс «ARCHE».

**Падрыхтавала Тацяна Вабішчэвіч**

## У Беларускім ПЭН-Цэнтры

**13 траўня а 16-й гадзіне ў ПЭН-Цэнтры (вул.Казлова, 7-101) адбудзецца сустрэча з францускім сацыёлягам Рананам Эрвуэ (унівэрсытэт Бардо),** які вывучае беларускія дачы і дачнікаў. Удзел возьме таксама беларускі палітоляг Алесь Лагвінец.


**«Наша Ніва» запрашае** да супрацоўніцтва рэклямных агентаў на выгадных умовах. Інфармацыю пра сябе дасылайце на электронны адрас nn@promedia.by.
Т./факс: 284-73-29.


## КОНКУРС «НН»

**Ч**араўнік **А**днойчы **Ж**артам **З**асакрэціў, **Б**ыццам **С**карбы, — **Ф**арбы.

**Ляля Кабачэўская, Менск**

**Ч**алавек **П**адтрымлівае/**А**бірае **Ж**ыцьцё, **З**магаючыся **Б**адзёра **С**упраць **Ф**альшы!

**Уладзіслаў Жыгалка, Менск**

**Ч**мель **П**ершы/**А**пошні **Ж**артаваў **З** **Б**арадатым **С**ытым **Ф**ілінам.

**Зьміцер Панкавец, Кастрыца**

Наступны нумар «НН» выйдзе **16 траўня**, у пятніцу. У Менску ў продажы — з абеду чацьвярга.

## ПАШТОВАЯ СКРЫНКА

**М.Лэлэку.** Ваш канвэрт прыйшоў пусты. Відаць, забыліся нешта ўкласьці.

**Дзіне Б. зь Ліды.** У дасланых Вамі варыянтах спэктральных памятак ёсьць памылка: словы, што пачынаюцца на «а» і «п», мусяць быць узаемазамяняльнымі (аранжавы/памаранчавы).

**Зьмітру Ц. з yahoo.com.** Ня вы адзін чакаеце беларускае дзіцячае чытанкі-хрэстаматыі. Што «НН» можа зрабіць — гэта найперш зьвесьці тых, хто хацеў бы спрычыніцца да выданьня такой кнігі. Бо сама «НН» ня мае выдавецкае ліцэнзіі (яе маюць выдавецтвы, кшталту «Беларускага кнігазбору»), а ў цяперашнім складзе Рэдакцыі няма людзей, здольных прафэсійна такую кнігу ўкласьці. Таму папросту і Вашы каардынаты дамо іншым ахвотным паспрыяць выданьню такой чытанкі, а Вы там ужо самаарганізуйцеся.

**Віталю С. зь Менску.** Тэма важная, але для чытачоў «НН» гэта ўжо відавочна. Спрачацца тутака варта хіба на старонках дзяржаўных выданьняў. Паспрабуйце, дарэчы, прабіцца туды з сваім артыкулам.


**Наша Ніва** КУПОН БЯСПЛАТНАЙ ПРЫВАТНАЙ АБВЕСТКІ

Запоўніце гэты купон, і мы надрукуем Вашу абвестку (ня больш за 15 словаў) бясплатна. А/с 537, 220050, Менск.

Тэкст ______

Імя і прозьвішча ______

Адрас, тэлефон ______



**Наша Ніва**

незалежная газэта

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991

**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

| | |
|---|---|
| сакратарка рэдакцыі | Наста Бакшанская |
| галоўны рэдактар | Андрэй Дынько |
| выпускны рэдактар | Сяргей Ёрш |
| карэктар | Сяргей Петрыкевіч |
| карэктарка | Галіна Рабянкова |
| нам. галоўнага рэдактара | Андрэй Скурко |
| тэхнічны рэдактар | Андрэй Чык |
| выдавец і заснавальнік | Фонд выданьня газэты «Наша Ніва» |

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32.**
**E-mail: nn@promedia.by**
**On-line: www.nn.by**


© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая.

8 палос фарматам А2. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня № 581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусі. Юрыдычны адрас: г. Менск, вул. Калектарная, 20а, п. 2а.

Наклад 3509.

Нумар падпісаны ў друк 11.05.2003.

Замова № .

Рэдакцыйны адрас: Менск, Калектарная, 20а/2а